WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ВЕРАСНЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 178
(26786)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | IV квартал |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 |

Заставайцеся з намі!

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «У МІНСКУ НЕАБХОДНА РАЗВІВАЦЬ І ДОБРАЎПАРАДКОЎВАЦЬ ПАРКАВЫЯ ЗОНЫ»

**Такую думку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў 10 верасня, наведваючы сталічны парк Перамогі, размешчаны на беразе Камсамольскага возера.**



Фота БЕЛТА.

«Добра, што ў нас ёсць такія паркі, дзе людзі могуць адпачываць, займацца спортам, проста гуляць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Мэр Мінска Мікалай Ладуцька і галоўны архітэктар сталіцы Віктар Нікіцін далажылі Прэзідэнту аб тым, як вядзецца добраўпарадкаванне беларускай сталіцы. У прыватнасці, аб аднаўленні Лошыцкага сядзібна-паркавага комплексу ў Мінску, будаўніцтве аквапарку на праспекце Пераможцаў. Аляксандр Лукашэнка даручыў уважліва паглядзець на закінутыя тэрыторыі ўнутры Мінскай кальцавой дарогі і заняцца іх забудовай і прывядзеннем у парадак.

Аднак асноўная ўвага была засяроджана на добраўпарадкаванні Камсамольскага возера, парку Перамогі і прылеглых тэрыторый.

Канцэпцыя парку Перамогі была распрацавана ў 2005 годзе, а першыя работы тут пачаліся ў снежні 2008 года. Агульная тэрыторыя парку складае каля 200 га. Ён будзе падзелены на некалькі зонаў, у прыватнасці мемарыяльную, культурна-масавых мерапрыемстваў, гісторыка-пазнавальную, спартыўную, дзіцячую гульнявую, ціхага адпачынку і прагулак, а таксама грамадскага харчавання. Па перыметры парку ўздоўж Камсамольскага возера будзе пракладзена пешаходная дарожка, каля якой будуць размешчаны пляцоўкі адпачынку і аб'екты грамадскага харчавання. З'явіцца таксама веладарожка працягласцю 2,5 км.

Цяпер поўнасцю рэканструяваны пешаходныя дарожкі (амаль 25 км), пабудавана пляцоўка для правядзення канцэртаў, выканана добраўпарадкаванне экалагічнага Птушынага вострава, будаўніцтва пешаходнага моста і вострава Камсамольцаў са спартыўнымі пляцоўкамі для актыўнага адпачынку. Акрамя таго, падрыхтаваны гасцявыя стаянкі на 300 машына-месцаў, сістэма асвятлення тэрыторыі з рознымі рэжымамі асветленасці ў залежнасці ад часу сутак, а таксама дэкаратыўная падсветка асноўных збудаванняў парку. Уздоўж Камсамольскага возера ўладкаваны пляжы, ёсць шматлікія пункты грамадскага харчавання, поўнасцю добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя.

У парку працуе і некалькі фантанаў: «Перамога» і «Вечнасць», а таксама шматструменны святлодынамічны фантан на вадзе «Ветразь». У выхадныя і святочныя дні будзе працаваць колеравая падсветка, у астатні ж час фантан будзе функцыянаваць у эканамічным рэжыме.

Усяго на праведзеныя работы затрачана каля Br90 млрд.

Прэзідэнт зрабіў прагулку на пасажырскім катары па Камсамольскім возеры і з вады агледзеў, як добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя. Ён прагуляўся па экалагічным Птушыным востраве, набярэжнай возера, пагутарыў з мінчанамі, якія тут адпачываюць. Прэзідэнт падкрэсліў, што такія гарадскія зоны адпачынку ствараюцца спецыяльна для людзей, каб яны маглі ў любы час, не ад'язджаючы далёка ад дома, прагуляцца, заняцца спортам або пазагараць у добрае надвор'е.

Аляксандр Лукашэнка ў цэлым станоўча ацаніў праведзеную работу па добраўпарадкаванні гэтай зоны. «Добра, што ёсць веладарожкі, шмат прагулачных сцежак, — сказаў Прэзідэнт. — Летам гараджане могуць свабодна купацца, адпачываць, загараць разам з дзецьмі».

Прэзідэнт даручыў зарыбляць вадаём, каб тут маглі праводзіць час і аматары рыбалкі. Што ж датычыцца зялёнай зоны, то, на думку кіраўніка дзяржавы, неабходна ўсё «рабіць прасцей, каб арганічна ўспрымалася».

Падагульняючы ўбачанае, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Галоўнае, што мы добраўпарадкавалі парк, што кожны чалавек можа тут і адпачыць, і ўмацаваць здароўе».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ РАСІІ І БЛІЗКІМ ЗАГІНУЛЫХ АД ТЭРАКТА ВА УЛАДЗІКАЎКАЗЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву, родным і блізкім загінулых у выніку тэрарыстычнага акта на Цэнтральным рынку Уладзікаўказа.

## МАЛАДАЯ СТАЛІЦА

**У ДЗЕНЬ горада на Кастрычніцкай плошчы ўвечары адбудзецца грамадска-культурнае мерапрыемства «Белы канцэрт». Чаму яго можна назваць «белы», разважаць трэба будзе пасля акцыі, таму што а 19-й гадзіне Палац Рэспублікі абяцае падарунак мінчанам — канцэрт Лонданскага філарманічнага аркестра. Але каму не пашчасціць патрапіць на канцэрт, то можна проста прыйсці на Кастрычніцкую плошчу — дзеля мультымедыйнага шоу, якое рыхтуюць спецыяльна да свята горада.**

Гуляць да ночы і нават пазней можна, калі рабіць гэта культурна. Напрыклад, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь абяцае працаваць да 3-х гадзін ночы з суботы на нядзелю — абы толькі як мага больш чалавек наведала выставу **«Зямля пад белымі крыламі»**.

Але не варта чакаць ночы, каб ісці ў музей, бо днём там падрыхтавана цудоўная праграма. Настаўнікі і вучні дзіцячай музычнай школы № 14 будуць іграць джазавую і эстрадную музыку. Але як жа без Моцарта, Брамса, Шапэна, Бетховена?.. Стыпендыяты спецыяльнага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі Дар'я Бабко і Павел Кашчэва выканаюць творы гэтых кампазітараў.

**«Магію Сярэднявечча»** 11 верасня будуць выклікаць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Поўная таямнічых цудаў, гэтая імпрэза прызначана на вечар — пачатак у 18 гадзін. Згадваць пра беларускае Сярэднявечча ў музеі — абсалютна натуральная справа, бо, адчыніўшы дзверы залаў, ты сапраўды трапляеш у атмасферу тых часоў — мэбля, вопратка, зброя, манеты... І што цікава — у Дзень горада абсалютна бясплатна.

**«Сустрэчы ў Траецкім»** ладзіць у суботу Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. Калі вы аматар музыкі ў спалучэнні з паэзіяй, то ў 18 гадзін для вас пачнецца літаратурна-музычная імпрэза з удзелам беларускіх паэтаў і бардаў — Аляксея Галіча, Дзмітрыя Пятровіча, Барыса Вайханскага, Алеся Гібок-Гібкоўскага, Вікі Трэнас, Юліі Новік, Маргарыты Аляшкевіч, Яны Явіч.

Ля Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў 18 гадзін, напэўна, будзе не менш наведвальнікаў: абяцаюць майстар-клас Масуда Талібані, які вядомы па ўдзеле ў шматлікіх беларускіх гуртах — ён іграе на барабанах. І сцвярджае, што гэтаму можа навучыцца кожны. Можна паспрабаваць спяваць, як бард Вольга Акуліч. Але лепш паслухаць яе песні, а потым і спевы гурта «Дзівасіл» — на зыходзе вечара цёплая і родная музыка сагрэе душу. Як і неўміручае слова Купалы — на выставе ў музеі ўпершыню будзе прадстаўлена копія поўнага рукапісу паэмы «Курган» (арыгінал захоўваецца ў Лондане).




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей СІДОРСКІ:

## «АЖЫЯТАЖНАГА ПОПЫТУ НА КРУПЯНЫЯ ВЫРАБЫ Ў БЕЛАРУСІ НЯМА»

**Ажыятажнага попыту на крупяныя вырабы, які назіраецца ў суседніх дзяржавах, у Беларусі няма, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ўчора ў час рабочай паездкі ў Ліду, адказваючы на пытанне БЕЛТА.**

«У краіне дастаткова запасаў харчовых тавараў, у тым ліку крупяных вырабаў усёй наменклатуры, пачынаючы ад грэчкі і заканчваючы просам, аўсянымі камякамі, — сказаў кіраўнік урада. — Мы забяспечваем свае патрэбнасці ў поўным аб'ёме».

Паводле яго слоў, грэчка актыўна ўбіраецца з палёў, паступае на перапрацоўчыя прадпрыемствы, якія працуюць стабільна. Сяргей Сідорскі выказаў упэўненасць у тым, што «грэчкі ў продажы будзе столькі, колькі патрэбна». А нейкі ажыятаж вакол крупяных вырабаў ён назваў «падагрэтым».

Паколькі Беларусь — транзітная краіна, то яе актыўна наведваюць і ўкраінцы, і расіяне. «На мінулым тыдні па маім даручэнні пацікавіліся ў прылеглых рэгіёнах Расіі і высветлілі, што там — беларуская грэчка, — сказаў прэм'ер-міністр. — Не страшна, у нас гэтай прадукцыі хапае. Акрамя таго, апошнія дні павялічаны аб'ёмы вытворчасці круп, каб забяспечыць гандаль». Калі ж узнікаюць нейкія перабоі з наяўнасцю гэтых вырабаў на прылаўках, то гэта звязана з рытмічнасцю пастаўкі тавараў у гандлёвую сетку. Сяргей Сідорскі асабліва спыніўся і на пытанні цаны на крупы. Каб папярэдзіць адток беларускай грэчкі ў Расію, дзе цана на яе ў два разы вышэйшая, было прынята рашэнне крыху ўзняць цану на гэту прадукцыю ў Беларусі. Пры гэтым, падкрэсліў Сяргей Сідорскі, грэчка будзе таннейшая, чым за межамі нашай краіны.

Прэм'ер-міністр у Лідзе наведаў два аб'екты гандлю, азнаёміўся з асартыментам прадукцыі, пацікавіўся тым, ці адчуваецца дэфіцыт якіх-небудзь тавараў. Ён пераканаўся ў тым, што пакупніцкі попыт задавальняецца цалкам.

«Нагнятанне непатрэбных страсцяў ні да чаго добрага не прыводзіць», — сказаў прэм'ер-міністр. А што датычыцца наяўнасці ў гандлёвай сетцы сметанковага масла, то праблемы з гэтай прадукцыяй быць у прынцыпе не павінна. Усе малочныя камбінаты забяспечаны малаком, у нармальным рэжыме функцыянуюць перапрацоўчыя прадпрыемствы. «Каля 80 працэнтаў ад агульнага аб'ёму выпрацаванага ў Беларусі сметанковага масла ідзе на экспарт, — адзначыў Сяргей Сідорскі. — Нам нічога не значыць на працягу аднаго дня разгарнуць частку экспартных патокаў на ўнутраны рынак».

## Закупачныя цэны на грэчку для вытворчасці круп павялічаны ў 1,5 раза

Закупачныя цэны на грэчку, што пастаўляецца для перапрацоўкі ў крупы, у Беларусі павялічаны ў 1,5 раза. Рашэнне аб гэтым змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1305 ад 9 верасня, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дорожно-строительный трест № 5» (продавец)** проводит открытый аукцион по продаже здания служебно-бытового корпуса (инв. № 611/С-10530), об. пл. 1670,2 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Березинский район, г. Березино, ул. Зеленая, д. 22.**

**Начальная цена с НДС – 228 597 607 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,3289 га.**

**Задаток в сумме 20 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **14.10.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 13.10.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

## УРА — БАБІНА ЛЕТА!

**На тэрыторыю нашай краіны пачынае паступаць больш цёплае, але вільготнае паветра з Заходняй Еўропы, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

У нядзелю магчымы кароткачасовыя дажджы. У ноч тэмпература паветра не перасягне 6—12 градусаў цяпла, месцамі чакаецца туман. А днём вераснёўскае сонца прагрэе паветра да 16—22 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня надвор'е парадуе нас цёплымі дзянькамі бабінага лета. Дарэчы, па народным календары бабіна лета звычайна прыпадае на перыяд з 14 па 21 верасня. У панядзелак у асноўным будзе без ападкаў. Тэмпература паветра днём павысіцца да 17—23 градусаў цяпла. Цёплым абяцае быць надвор'е таксама ў аўторак і ў сераду. У начныя гадзіны прагназуецца ад 6 да 12 градусаў цяпла, а днём — 18—24 градусы. У беларускай сталіцы ў гэтыя выхадныя дні чакаецца ўмерана цёплае надвор'е. Днём у суботу і ў ноч на нядзелю прагназуецца кароткачасовы дождж. Нядзельным днём будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ў ноч на суботу складзе 9—11 градусаў цяпла, днём прагназуецца плюс 15—17 градусаў. У ноч на нядзелю чакаецца плюс 8—10 градусаў, а днём паветра прагрэецца да 18—20 градусаў.

## У ЗАЛАТУЮ ВОСЕНЬ — З РЫЖЫМ КОЛЕРАМ ВАЛАСОЎ

**Сёлетняй восенню будуць, як ніколі, актуальныя агніста-рыжыя пасмы валасоў, у тым ліку і з залацістым адценнем. Пра гэта расказала ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА трэнер нацыянальнай зборнай па жаночых відах работ, цырульнік-мадэльер Наталля Ходанава.**



Для брунетак прапануюцца цёмныя адценні валасоў колеру горкага шакаладу або каштану, для бландзінак — крыху высветленыя асобныя пасмы, але не больш чым на адзін-два тоны. Стрыжкі «боб» і «карэ» застаюцца лідарамі прычосак ужо не адзін сезон, будуць яны актуальныя і гэтай восенню, адзначыла Наталля Хаданава.

## ТРЫ ТАНКІСТЫ, ТРЫ ВЯСЁЛЫЯ... БРАТЫ

**Заўтра ў Беларусі будзе святкавацца Дзень танкістаў. Гэтае свята з'явілася ў 1946 годзе для таго, каб адзначыць важнасць бранятанкавых і механізаваных войскаў, іх заслугі ў Вялікай Айчыннай вайне ды ўнёсак танкабудаўнікоў. Поспех у Сталінградскай і Курскай бітвах, у аперацыі «Баграціён» шмат у чым забяспечылі танкавыя войскі. У сучасным беларускім войску асобнае месца займаюць танкавыя фарміраванні асобных механізаваных брыгад. Я пабываў у адной іх — у 120-й асобнай гвардзейскай Рагачоўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава механізаванай брыгадзе імені Вярхоўнага Савета БССР.**




**ЦІКАВА:**

**— ТАНКІСТ ПАВІНЕН БЫЦЬ НЕ БОЛЕЙ 175 САНТЫМЕТРАЎ РОСТАМ.**

**— ПЕРШЫ СТРЭЛ ПАСЛЯ КАМАНДЫ ЭКІПАЖ ТАНКА ПАВІНЕН ЗРАБІЦЬ ЗА 15 СЕКУНД.**

Са сваімі будучымі суразмоўцамі я сустрэўся ў палявых умовах. Пакуль у казармах ідзе рамонт, салдаты жывуць у намётах. Мне сказалі, што тут служаць разам тры родныя браты — Дзмітрый, Юрый і Уладзімір Гардзейчукі, якія з'яўляюцца экіпажам аднаго танка. Мы размясціліся з імі ў адным з намётаў і пагутарылі.

— Першы раз у танку было не страшна. Наадварот, цікава. Мы ж спачатку навучаліся на спецыяльных камп'ютарных трэнажорах. А яны ствараюць сапраўдныя ўмовы знаходжання ў баявой машыне: едзеш па купінах — цябе трасе, спыняешся — кідае наперад па інерцыі... — расказвае Дзмітрый, механік-кіроўца. — Тым больш, што ўсе прыборы тут — як у сапраўдным танку.

Хлопцы ўжо цэлы год адслужылі. Былі на некалькіх вучэннях. А для таго, каб стаць танкістамі, ім давялося навучацца чатыры месяцы. У агульным, таму што механік і наводчык падрыхтоўваюцца за тры месяцы, а вось камандзір танка павінен вывучаць і тактыку. Даволі хутка. «Так, так, — згаджаецца Уладзімір, камандзір танка. — За чатыры месяцы, можна сказаць, і адбываецца падрыхтоўка экіпажу баявой машыны». А як жа практыка? «У час вучэбкі мы кожны дзень стралялі, акрамя, вядома, выхадных», — хутка адказвае Юрый, наводчык прылады.

— Калі вы адчулі, што ўжо можаце называць сябе танкістамі?

— Толькі пасля першага сапраўднага стрэлу, — кажа Уладзімір. — Танкіст — гэта той, хто стрэліў «штатку», вялікі снарад, які важыць 23 кілаграмы.

— А як прайшоў ваш першы стрэл? Патрапілі?

— Так, дакладна! — па статуце і з годнасцю адказаў камандзір танка.

— А бывалі няўдалыя стрэлы?

— Вядома. Часам гільза можа разарвацца ўнутры ствала. Але гэта зусім не страшна: толькі невялікая пстрычка. Пасля проста трэба дастаць сапсаваны снарад, — запэўніў мяне Уладзімір.

За час службы хлопцы паспелі паўдзельнічаць у парадзе. «Давялося два месяцы трэніравацца на аэрадроме ў Ліпках тры разы на тыдзень, — распавядае механік-кіроўца. — Там жа трэба было ехаць вельмі акуратна, каб прыгожа атрымалася. Вельмі хваляваўся».

Вось такія яны, сучасныя танкісты. Хутка гэтыя хлопцы вернуцца на «грамадзянку», і, магчыма, ужо больш ніколі не сядуць у танк, але кожны год яны па праве будуць святкаваць Дзень танкістаў і ганарыцца тым, што служылі ў танкавых войсках.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Час кахаць і час служыць

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СКАНДАЛ: САЛДАТЫ ЗША АДРАЗАЛІ ЧАСТКІ ЗАБІТЫХ АФГАНЦАЎ НА ПАМЯЦЬ

**Амерыканскія следчыя ўстанавілі, што 12 вайскоўцаў войска ЗША стварылі ў Афганістане «каманду смерці», удзельнікі якой уладкоўвалі расправы над мірнымі жыхарамі.**



Дакументы, апублікаваныя вайскоўцамі, сведчаць, што не менш як 5 салдатаў здзейснілі сёлета некалькі забойстваў. Яшчэ сямі вайскоўцам прад'яўлены абвінавачванні ў змове з мэтай утойвання злачынстваў калег. Пры гэтым, паводле апублікаваных дакументаў, салдаты самі прыдумлялі «сцэнарыі» забойстваў мірных афганцаў.

Усе падазраваныя служылі ў 5 армейскай брыгадзе БМП «Страйкер», якая дыслацыруецца ў Афганістане з мінулага года і ўдзельнічала ў цяжкіх баях у правінцыі Кандагар. Следства падазрае іх у тым, што вайскоўцы раздзялялі целы забітых, выкарыстоўвалі косткі і зубы ў якасці трафеяў, здымалі ўсё гэта на фотакамеры, а таксама ўжывалі наркотыкі і пагражалі калегам расправай, калі тыя раскажуць пра іх дзеянні. Зрэшты, следству на судзе яшчэ трэба будзе даказаць, што гэтыя знаходкі салдаты захоўвалі менавіта як «ваенныя трафеі».

### СЛУЖБОВЕЦ ПРЫМУШАЎ ДЗЯЦЕЙ ЦАЛАВАЦЬ ЯГО НОГІ

**Кіраўнік Ермякееўскага раёна Башкірыі Дыфгат Хантымераў прымушаў вучняў адной са школ цалаваць яго ногі і падлогу падчас уроку фізкультуры.**



На відэаролiку, які паглядзелі тысячы карыстальнікаў сеціва, было бачна, як кіраўнік раёна прымушаў вучняў адцiскацца да знямогі, крычаў на іх і камандаваў: «Нагу цалуй!», «Дошку цалуй!». У пятніцу ўпаўнаважаная па правах дзіцяці ў рэспубліцы Лілія Гумерава пабывала ў школе, у якой быў зняты відэазапіс. Па яе словах, для таго, каб службоўца можна было прыцягнуць да адказнасці, бацькі павінны напісаць заяву ў міліцыю. Аднак у тым, што заява будзе напісана, яна сумняваецца: бацькі спалохаюцца і не захочуць прымаць нейкія меры. Тым часам следчыя органы рэспублікі правялі па факце праверку, аднак крымінальнай справы ў адносінах да службоўца ўзбуджана не было «з-за адсутнасці складу злачынства». Тым часам Хантымераў паспрабаваў адшукаць чалавека, які зняў на камеру мабільнага тэлефона яго здзекаванні. Аднак калі гэта зрабіць не атрымалася, ён настроіўся на інтэрнэт, які стаў прычынай яго бед. Службовец забараніў працягнуць оптавалакно ў сяло Ратамак, а ў іншым месцы, дзе да таго моманту ўжо пачалася падрыхтоўка да свідравання свідравіны праз раку, заканчваць работы забараніў.

### ПЕНСІЯНЕР-СТРАЛОК НАПАЎ НА ПАЛІЦЭЙСКІХ

**Пажылы мужчына, які адкрыў у ноч на 9 верасня агонь па мінаках у швейцарскім горадзе Біль, уначы вярнуўся да месца здарэння. Пенсіянер некалькі разоў стрэліў у бок паліцэйскіх, а потым ізноў уцёк.**

Затрымаць мужчыну вартавыя парадку не паспелі. Пра пацярпелых не паведамляецца. Раней пенсіянер цяжка параніў аднаго з паліцэйскіх. Раніцай 10 верасня ачапленне было знятае, але пошукі ўзброенага пенсіянера працягваюцца.

### МАЛАХАЎ ВЫРАШЫЎ ЗАВЯЗАЦЬ З ТЭЛЕБАЧАННЕМ

**«Народны лекар» і тэлевядучы Генадзь Малахаў абвясціў пра тое, што не збіраецца вяртацца на тэлебачанне. Праз некалькі дзён пасля шуміхі з яго знікненнем «тэлелекар» быў знойдзены жывым і здаровым у сваёй хаце ў Растоўскай вобласці.**

Ён заявіў, што мае правы сысці з Першага канала, бо праграма змяніла назву, што не было прадугледжана кантрактам. Малахаў паскардзіўся, што за чатыры гады ён зняўся прыкладна ў тысячы праграм і гэта праца «высмактала з яго ўсе сокі». Па словах «лекара», ён разлічваў на тое, што здымкі будуць займаць паўтары гадзіны ў суткі, але, насуперак абяцанням кіраўніцтва Першага канала, час працы перад камерай увесь час павялічваўся. У адказ прэс-служба Першага канала заявіла, што кантракт Малахава можа быць скасаваны ў аднабаковым парадку толькі пры ўмове выплаты вялікай няўстойкі і кампенсаванні страт, якія канал панясе з-за сыходу вядучага.

## САБАКА ЎЗЯЎ СЛЕД

З крамы ў Брэсце нехта выкраў 41 бутэльку каньяку. Сабака вывеў на 25-гадовага беспрацоўнага. З дапамогай сабакі быў затрыманы і жыхар Жабінкі. Зваршчык ПМК выбіў шыбу і спрабаваў украсці касавы апарат.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.09.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 031,00 | 1 чэшская крона | 156,42 |
| ▲ 1 еўра | 3 854,52 | 1 польскі злоты | 982,02 |
| 1 латвійскі лат | 5 445,07 | ▼ 1 расійскі рубель | 98,11 |
| 1 літоўскі літ | 1 117,58 | 1 украінская грыўня | 382,87 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 30,8937 |
| 10 UAH | 39,0146 |
| 1000 BYR | 10,1825 |
| EUR | 39,1917 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

## ЛАЗНЯ ЁСЦЬ, А СУМЛЕННЕ?

**У рабочы час спецыялісты першага Гомельскага мантажнага ўпраўлення будавалі цяпліцу і лазню на дачным участку дырэктара прадпрыемства і атрымлівалі за гэта заробак.**

Такі факт выяўлены Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці падчас праверкі абгрунтаванасці разлікаў першага Гомельскага мантажнага ўпраўлення ААТ «Гомельтэхмантаж» за выкананне будаўніча-мантажных работ. Пяцёра работнікаў будаўнічай брыгады ўчастка № 3 ГМУ-1 паведамілі, што ў рабочы час па заданні дырэктара на зямельным участку, афармленым на ягоную жонку, узводзілі цяпліцу, лазню і пешаходныя дарожкі. Спецыялісты дзяржкантролю ўстанавілі, што з красавіка па ліпень гэтага года пяцёра рабочых прадпрыемства адпрацавалі на дачы кіраўніка 272 працоўныя дні. Выкананне ж работ аплачвала прадпрыемства: рабочыя неабгрунтавана атрымалі заработную плату ў памеры 12,7 млн рублёў. У такую суму ацэнены страты, нанесеныя прадпрыемству майстрам участка № 3 і дырэктарам ГМУ-1. Пасля праверкі ў жніўні кіраўнік прадпрыемства вярнуў згаданую суму ў бухгалтэрыю і такім чынам пакрыў страты ў поўным аб'ёме. По факце ўзбуджана крымінальная справа.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


### КАМАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### объявляет о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **14 октября 2010 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3-й этаж, каб. 58) через 30 дней после выхода объявления** | | | |
| **Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена** | **Адрес участка** | **Площадь, га** | **Кадастровый номер** | **Начальная цена, бел. руб.** |
| | Камайский сельсовет, д. Лодоси, ул. Приозерная, 40 | 0,2490 | 224081822801000038 | 3 000 000 |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона** | - внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах;<br>- возмещение соответствующему исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков;<br>- государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>- занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации | | | |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка, который предполагается предоставить в частную собственность по результатам аукциона** | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского района: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 | | | |
| **Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования | | | |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), по субботам с 9.00 до 14.00 с 15 сентября по 11 октября 2010 года включительно | | | |
| **Сумма расходов, подлежащих возмещению организатору аукциона на его проведение (уплачивается победителем по соответствующему лоту помимо суммы, заявленной на торгах)** | 1 627 322 бел. руб. | | | |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10 % от начальной стоимости предмета аукциона (300 000 рублей) до подачи заявления путем внесения на расчетный счет Камайского исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе | | | |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), по субботам с 9.00 до 14.00, телефоны: 8 (02155) 43180, 41132. | | | |

### НОВОСЕЛКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### объявляет о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **14 октября 2010 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3-й этаж, каб. 58)** | | | |
| **Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена** | **Адрес участка** | **Площадь, га** | **Кадастровый номер** | **Начальная цена, руб.** |
| | Витебская обл., Поставский р-он, Новоселковский сельсовет, д. Гавриловичи, ул. Приозерная, 29 | 0,2296 | 224084003601000050 | 8 000 000 |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона** | - внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах;<br>- возмещение соответствующему исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков;<br>- государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>- занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации | | | |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка, который предполагается предоставить в частную собственность по результатам аукциона** | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского РИК г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 | | | |
| **Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования | | | |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), по субботам с 9.00 до 14.00 с 15 сентября по 11 октября 2010 года включительно | | | |
| **Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение (уплачивается победителем по соответствующему лоту помимо суммы, заявленной на торгах** | 1 442 928 бел. руб. | | | |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10 % от начальной стоимости предмета аукциона (800 000 рублей) до подачи заявления путем внесения на расчетный счет Новоселковского исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе | | | |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), по субботам с 9.00 до 14.00, телефоны: 8 (02155) 43180, 41132. | | | |


Хто каго?

# «НЕ ЗНАЙСЦІ МАЦНЕЙ САЮЗА: ДЗЕ МАСТАК, ТАМ НЕДЗЕ І МУЗА...»

**...Мо, прыдумка, а мо і праўда было. Бацька з дарослым сынам у дарогу сабраліся — загадзя білеты купілі, паклажу узялі, на вакзал прыехалі, нават на платформу прыйшлі (ці прыбеглі?..). А цягнік — галоўнае, перад саменькім носам у іх! — дзверы зачыніў і... паехаў. «Пасажырам» мову адняло! У абодвух рукі апусціліся (чамаданы — адпаведна — вобзем)...**

**Першым да памяці бацька неяк дайшоў: руку адвёў і сыну ў вуха як дасць! Той аж пахіснуўся! Пытае:**

**— Тата, за што?.. Чаму?**

**Той у адказ:**

**— А што рабіць мне?! Што рабіць, га?!**

**Згадзіцеся: складанае пытанне! І адказаў на яго ну вельмі часта нямашака. Прычым не толькі ў нейкіх экстрэмальных сітуацыях. Нават падумаўшы. Ну напрыклад: надрукавалі мы чарговы конкурсны здымак, папрасілі чытачоў прыдумаць подпіс. А тут жнівеньская спёка. Аж асфальт стаў плавіцца, не тое што мазгі... Не да вершаў людзям! У выніку — замест соцень варыянтаў (як заўсёды было) у рэдакцыю дзясяткі прыйшлі. І «што рабіць», як той казаў? «Аглядаць»? Як быццам, не варта, бо няма чаго, лічы. А не аглядаць — нельга: людзі ж пісалі, стараліся. Таму...**

І зноў жа байка ў тэму. Мужык адзін хваробу нажыў — ні самому паглядзець, ні другім паказаць (гемарой называецца). Дзень з ім прамучыўся, два, тры... Не праходзіць сам па сабе! Падаўся ратунку шукаць. А ў аптэцы, як вядома, жанчыны за прылаўкам стаяць. Не будзеш жа ім пра свой... Пра сваю хваробу расказваць. Выгляд зрабіў, што гэта ён некаму лекі бярэ: у кішэню заціснуў і ходу — як прымаць, не спытаўся. Рашыў: па адной пілюлі тры разы ў дзень. Як большасць...

Але ж яму ну вельмі кепска было! Таму ён па тры прымаў, каб хутчэй спрацавала...

Марна...

Зноў у аптэку падаўся: той самай кабеце пустую ўпакоўку ад свечак паказаў, — папрасіў, каб такую ж поўную дала. Яна тут жа, ад слова! Хоць і здзівілася... А назаўтра той самы хворы зноўку ідзе. І па тыя ж лекі... Ну кабета і не стрымалася, пытае:

— Вы ясце іх, ці што?!

Мужык таксама не стрымаўся (ведама, хворы), кажа:

— Не, я іх у з... засоўваю!

...Пасмяяліся? То цяпер пагодзіцеся: няма горш, як не ведаеш і «што рабіць», і як...

Горш за тое — не думаеш, не пытаешся! Ну вось глянуў на конкурсны здымак спадар Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна і чамусьці вырашыў, што на ім — нейкі рынак. Тады цалкам лагічна было б меркаваць:

*Адпачыць прылегла Маня,*
*Спіць і сніць пры гэтым*
*Падвясныя сталяванні*
*І еўрапакеты...*

Трэба сказаць, для восені актуальныя сны ў жанчыны. Бо гэта ж задавальненне якое, калі ў хаце не толькі прыгожа, але і цёпла!

Адно — не таннае. Задавальненне. Гэта вам кожны скажа, хто рамонтам займаўся — столі мяняў, вокны, падлогі, дзверы... Адкуль радкі спадара Гаўрыша з Пастаўшчыны:

*Змаглася муза мастака:*
*А грошай — не чакаецца...*
*Вунь жонка Колькі-маляра*
*У золаце купаецца.*

Ад гэтага відовішча ды жанчына, згадзіцеся, можна і не заснуць, бо з пэндзлем жа і адзін, і другі, а вынікі розныя. Горш за тое, як прызнае Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч з в. Любань Лунінецкага раёна, сумныя:

*Гляджу на здымак гэты*
*І думаю:*
*цяпер паэты*
*Ды мастакі зусім не ў модзе*
*(У нашым споеным народзе)...*
*А заспяваеш пад фанеру, —*
*То грошай возьмеш да халеры.*

Вядомасці, зазначым, таксама. Бо прозвішчы тых, хто песні выконвае (нават «фанершчыкаў») на радыё ды тэлебачанні гучаць, прозвішчы ж аўтараў слоў і музыкі — амаль што не. Чаму? Версія адказу (а заадно і подпісу да здымка) у спадара Гарачова:

*Дзяцінства праляцела*
*і юнацтва,*
*Цяпер во старасць*
*да зямліцы гне...*
*А да вяршынь*
*высокага мастацтва*
*Магчыма дасягнуць*
*хіба што ў сне.*

Большасці людзей. Але ж ёсць адзінкі — пісьменнікі, паэты, кампазітары, мастакі, якія насамрэч дасягаюць! І радасць працы, Кузьма Чорны пісаў, патрабуе, каб усё, што добра зроблена, было заўважана і адзначана.

Але ж нам гэта не дужа ўласціва (мо таму, што талентаў зашмат?). Сведчаннем таму, як ні крыўдна, і наша, конкурсная пошта — ліст з той жа вёскі Даўнары:

*Мастакоў мясцовых хеўра*
*Прадае свае шэдэўры.*
*Ды адзінай пакупніцы*
*Ля іх твораў добра... спіцца,*
*Бо карцін тых — нібы сена!*
*Значыць, потым скінуць цэны.*

Пра іх жа, тыя цэны прозай расказала спадарыня Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна: у сталіцу неяк ездзіла — па тэатрах пахадзіла, па музеях. У мастацкі салон завітала. Прыгожыя карціны там! Шмат! Але ж і кошты... А на вуліцы, бачыць, маладыя мастакі



стаяць са сваімі творамі. Ёй пейзаж адзін спадабаўся. Спытала: «Пачым?» «Сорак...», — кажа хлапец. Яна па кашалёк — тут жа... «...Тысяч», — ён дадае. Карацей — не адбылася пакупка. Адкуль — парада (пакупнікам):

*Мо спяшацца*
*і не варта*
*Да далёкага Манмартра...*
*Зазірні спачатку, дружа*
*Да Палаца прафсаюзаў.*

Там і цяпер (не тое, што тады) за гэтыя тысячы ўжо можна нешта купіць, — з веданнем справы піша Любоў Міхайлаўна.

А паглядзець на творы мастацтва ды асалоду атрымаць дык і наогул можна задарма. Як і... паспаць:

*Нехта ходзіць любавацца,*
*Нехта ходзіць таргавацца,*
*Ну а нехта — адпачыць:*
*Дзякуй, хлопча, за карціну,*
*Не «спячэ» кабета спіну.*

Можа, значыць, «адарвацца». Тым больш, калі для гэтага ўсе падставы ёсць, як лічыць спадарыня Пажога з Глыбоччыны:

*Ах, кірмашовы вернісаж!*
*Там нацюрморт,*
*а там пейзаж!*
*...А тут, без абутку,*
*Гандлярка ляжыць:*
*Падаткі заплачаны, —*
*Соладка спіць.*

І, заўважым, не апошняе аддала: нераспранутая, туфлікі побач...

Гэтак жа спакойна і соладка можна спаць яшчэ ў адным выпадку. Пра яго піша спадарыня Аляхновіч са Слуцка:

*Баба гэтыя карціны (і зірніце, колькі! — **Аўт**.)*
*Прыцягнула з Украіны...*
*Зараз сілы набярэцца*
*І назад туды папрэцца.*

«А што рабіць?! Што рабіць?», як той з вакзала казаў, калі ва Украіне і насамрэч шмат што танней. І можна паехаць, купіць, прывезці. Потым прадаць, зноў паехаць (спецыяльныя сумкі з'явіліся)... Хоць гэта і вельмі цяжка! Таму так дарэчы тут будзе... калыханка, якую склаў для пчолак-«чаўночніц» спадар Гарачоў:

*Спі, мая куніца,*
*Спі, мая вавёрка,*
*Хай табе прысніцца*
*Пальма-дэ-Маёрка,*
*Ранішняя зорка,*
*Рыа, Каны, Ніца...*
*Спі, мая вавёрка,*
*Спі, мая куніца.*

А між іншым, тую Пальму..., зорку, Ніцу і не ў сне было б добра ўбачыць!..

Аднак гэта, як многія кажуць, не з нашым шчасцем. Што з нашым? Як ні крыўдна — байка (ці ўсё ж праўда?) з канверта. Збіраюцца, значыць, мастакі на прыроду — пейзажы пісаць. Старэйшы пытаецца:

— Мальберты ўзялі?

— Узялі.

— А пэндзлі?

— Таксама...

— І палітру?

— Не, па літру, падумалі, мала будзе. Узялі па два...

Адкуль — спадар Гарачоў, вуснамі гандляра:

*Нехта — дурань,*
*нехта — хітры,*
*Побач — воля і турма...*
*Ёсць палітра, ёсць паўлітра,*
*Ды натуршчыцы няма!*

Што нелагічна, бо павінна быць... І недзе побач! Гэта спадарыня Тарасік з Мінска дакладна ведае:

*Не знайсці мацней саюза:*
*Дзе мастак, там недзе й Муза*
*Яму думкі навявае...*
*А «навёўшы», — спачывае.*

І ўжо тады, на думку Галіны Іванаўны Галаўко з мястэчка Калодзішчы Мінскага раёна часу губляць не трэба:

*Мастак не спіць,*
*ён стаіць, мяркуе,*
*Як здзейсніць новы*
*хітры манеўр:*
*Прадаць партрэт,*
*пакуль спіць натура,*
*Затым падбіць...*
*На новы шэдэўр.*

Удасца гэта ці не — залежыць ад Музы (*«Так вядзецца праз вякі: Музы там, дзе мастакі»* А. Няхай, г. Мінск). Але ж калі яна такая, як піша спадар Ліпень з Іўеўшчыны, то лепш не будзіць. І не чакаць, пакуль прачнецца. Бо... рызыкоўна:

*Гэта «мілая» жанчына*
*Спіць не тварам да сцяны.*
*Таму міма — лепей з дрынам,*
*Калі до́рагі штаны.*

Але ж на гэтай, крыўднай (прынамсі, для жанчын), ноце завяршаць чарговы агляд не хацелася б. Таму — дыялог:

*Бог вярхоўны — богу Сонца:*
*— Не патрэбна, каб бясконца*
*Ты вадой Еўропу мыў...*
*Лепш спыніўся б, падсушыў...*
*Ды апошні знаў нямала:*
*Што Еўропа — да Урала.*
*Вось таму ад спёкі й млее*
*Беларусь з сястрой Расеяй.*

Гэтыя радкі ў спякотным жніўні напісаў Мікалай Старых з Гомеля, напісаў да здымка, які гэтую млявасць, на яго думку, якраз і паказваў.

Яшчэ адно меркаванне ў Зоі Пятроўны Янучок з в. Нагорнае Клецкага раёна:

*Цяпер фірмы дужа ў модзе*
*Пад назовам —*
*«Сем дзён свят»*
*Яе кадры на ўваходзе*
*Ноч працуюць, а днём «спят».*

Загадкавыя, трэба сказаць, фірмы: і назва шмат чаго вартая, і што робяць (а тым болей ноччу) не зразумець... Але ж няма нічога тайнага, што не стала б яўным. Хоць некалі...

Так, пераможцам нашага конкурсу на папярэднім этапе, па меркаванні вялікага чытацкага журы, сталі спадары Гарачоў, Гаўрыш і сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Кусянкова з Рагачоўшчыны і Пажога з Глыбоччыны. З чым пагадзілася і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету накіроўваецца ў вёску Абруб.

Хочаце, каб да вас? Тады, калі ласка, пішыце. Коратка (не больш за 8 радкоў) і дасціпна.

Здымак дадаецца.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



Бяседныя песні

## Вальс ростані

Іван Карэнда амаль па-юнацку сустракае восеньскую пару, калі ўсё наўкол ажыўлена напаўняецца навучальным гулам і ўскалыхвае ў памяці трапяткія імгненні супераджыванняў. У такі адметны перыяд пачаліся і яго асабістыя жыццёвыя, працоўныя дарогі.

Гэтаксама ўсхвалявана ўспрымае ён і пачатак лета, які ўзнаўляе ў адчуваннях і апошні школьны званок, і выпускны студэнцкі баль. Незабыўныя пачуцці ўвесь час увасабляюцца ў вершах. З гадамі яны яднаюцца ў паэтычныя цыклы, выходзяць кнігамі.

На вершы Івана Карэнды напісана нямала песень. Адна з іх — асаблівая. Яна ўвасквашае вельмі эмацыйна насычаны студэнцкі час, сяброў-таварышаў, затоеныя перажыванні і акрыляе юнацка-чыстай верай-мараю. Створаная сумесна з Васілём Раінчыкам песня «Вальс ростані» ўжо не адзін год рознагалоса выконваецца на моладзевых вечарынах, раздольна гучыць на рэспубліканскім студэнцкім балі.

### ВАЛЬС РОСТАНІ

Верш Івана Карэнды
Музыка Васіля Раінчыка

*Чародкаю буслінаю*
*На крылах маладых*
*Пранесліся шчаслівыя*
*Студэнцкія гады.*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Чародка тых буслоў,*
*Ды верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

*Бывай, жыццё юнацкае!*
*Сяброўскі гурт, бывай!*
*Вячоркі інтэрнацкія,*
*Мой друг, не забывай.*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Пара пяшчотных сноў,*
*Ды верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

*Хоць сталі мы дарослымі —*
*Слязу не выцірай.*
*Апошні вальс — вальс ростані*
*Іграй аркестр, іграй!*
*Мы ведаем: не вернецца*
*Цяпло расстайных слоў,*
*Ды верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*
*Нам верыцца, нам верыцца —*
*Сустрэнемся мы зноў.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**




### ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА И ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| Наименование предмета аукциона | Здание столовой и право заключения договора аренды земельного участка | Здание аптеки с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Подсобное хозяйство и право заключения договора аренды земельного участка | Производственное здание, здание сарая и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, 282 | Брестская обл., Брестский р-н, д. Новые Лыщицы, ул. Октябрьская, д. 25 | Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок | Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок | Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица | Брестская обл., Ивановский р-н, район д. Снитово |
| **Продавец недвижимого имущества** | ЭРУП «Опытная путевая машинная станция № 115» Белорусской железной дороги, тел. 80163 49 27 75, 49 27 81 | Брестское ТПРУП «Фармация», тел. 80162 41 69 50, 21 20 45 | Главное управление командующего внутренними войсками Министерства внутренних дел, тел. 80163 45 72 33, 45 25 01 | | ГЛХУ «Дрогичинский лесхоз», тел. 801644 3 64 16, 3 64 20 | РУПАД «Бреставтодор» тел. 8 0162 20 31 09 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Здание столовой 1982 г.п., 1-этажн., кирпичное, площадь – 386,3 кв.м. Земельный участок площадью 0,1131 га, под размещение объекта торговли, по оказанию услуг населению, административного, производственно-складского назначения, либо общественного питания, срок аренды – 30 лет с последующим продлением срока аренды. | Здание 1-этажн., 1953 г.п., площадь – 57,0 кв.м, холодная пристройка, погреб, сарай, уборная, воздушная линия 0,4 кВ, водопроводная сеть. Земельный участок площадью 0,1711 га, для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, для обслуживания жилого дома, срок аренды – 50 лет. | Специальное хранилище из бетона с четырьмя воздухозаборными трубами, площадь –1365,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,3004 га, срок аренды – 99 лет. | Сооружение специального хранилища из бетона, площадь – 951,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,5322 га, срок аренды – 99 лет. | Здание свинофермы 1992 г.п., площадь – 252,2 кв.м; пристройка, водонапорная башня; здание зернохранилища 1988 г.п., площадь – 308 кв.м; здание коровника 1987 г.п., площадь – 401, кв.м, весовая, сарай. Земельный участок площадью 0,8121 га, срок аренды – 50 лет. | Производственное здание – 1979 г.п, 1-этажн., кирпичное, площадь – 47,5 кв.м с пристройкой. Сарай – 1991 г.п, 1-этажн., кирпичное, площадь – 36,3 кв.м. Земельный участок площадью 1,6538 га, для размещения объектов по оказанию услуг, общественного питания, торговли, по согласованию с отделами архитектуры и строительства и экономики Ивановского райисполкома, срок аренды – 90 лет. |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 147 530 194 | 10 064 566 | 65 812 180 | 67 284 407 | 55 715 727 | 13 103 825 |
| **Сумма задатка, руб.** | 14 753 000 | 1 006 000 | 6 581 000 | 6 728 000 | 5 571 000 | 1 310 000 |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 8 0162 20 87 85, 23 12 63, 23 44 06, 21 19 82, www. brest–region.by** | | | | | |

Аукцион состоится **12 октября 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 11 октября 2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения местным исполнительным комитетом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 11 октября 2010 года включительно.**



Минский городской центр недвижимости

### УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 27 сентября 2010 года

## ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже принадлежащего ОАО «Минский фарфоровый завод» (продавец) изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-707995487, площадью 3230,8 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 91, пом. 2.**

Начальная цена – 7 233 990 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 723 399 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **27 сентября 2010 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.09.2010 по 24.09.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**
**(029) 386 39 40 – ОАО «Минский фарфоровый завод» (ул. Кропоткина, 91, 220002, г. Минск).**

Падарожныя нататкі

# ЯКІ БЕЛАРУСКІ ХРАМ НАТХНІЎ БАРСЕЛОНСКАГА АРХІТЭКТАРА АНТОНІА ГАЎДЗІ?

**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА даведаўся ў Барселоне, чаму іспанская інтэлігенцыя дамагаецца, каб храм Саграда Фамілія не дабудоўвалі**



**Паводле легенды, менавіта 7 чэрвеня 1926 года ў Барселоне быў пушчаны першы трамвай. Ярка-чырвоны вагон паехаў па рэйках на здзіўленне і забаву паспалітаму люду. У гэты ж дзень на скрыжаванні Гран Вія і Байлен пад трамвай патрапіў невядомы стары жабрак. Небараку завезлі ў новую лякарню Святога Крыжа, дзе ён і памёр неўзабаве, не прыходзячы ў прытомнасць. Старога ўжо збіраліся пахаваць у агульнай магіле, як раптам адна жанчына ўскрыкнула: «Госпадзі, дык гэта ж Антоніа Гаўдзі!»**

**Сёння асоба архітэктара Антоніа Гаўдзі і ягоныя творы прыцягваюць у Барселону каля 20 мільёнаў турыстаў штогод.**

## «Хлопчык непазбежна хутка памрэ»

У беларускай літаратуры мы маем аднаго героя, які адназначна мае прыналежнасць да горада — слаўны рагачовец Гервасій Выліваха з навелы «Ладдзя Роспачы» Уладзіміра Караткевіча. Маем і мясціны, якія звязваем з імёнамі выключна канкрэтных людзей — Мікалаеўшчына Коласа, Віцебск і Лёзна Шагала, Янава (Іванава) Напалеона Орды, Нясвіж Радзівілаў...

Барселона — гэта горад Гаўдзі.

— Слухай, а вось гэты Гаўдзі, ён што, быў галоўным архітэктарам Барселоны? — пачуў гэтымі днямі на вуліцы пытанне аднаго рускамоўнага турыста да другога.

У тым і рэч, што не быў. Больш за тое, кар'ера Гаўдзі пачалася са скандалу, звязанага менавіта з гарадскімі ўладамі Барселоны. Муніцыпалітэт замовіў архітэктару-пачаткоўцу стварыць ліхтары для Каралеўскай плошчы. Гаўдзі залупіў такі кошт, што гарадскія галовы пачалі квахтаць, як куры. Гэтыя ліхтары і сёння ўпрыгожваюць горад, але з тае пары муніцыпалітэт НІКОЛІ больш не звяртаўся да дона Антоніа.

Сам лёс Гаўдзі поўны містыкі і супярэчнасцяў. Смерць пільнавала Антоніа ад самага нараджэння. Ён з'явіўся на свет 25 чэрвеня 1852 года ў мястэчку Рэус, непадалёк ад Барселоны. Яго ахрысцілі ўжо на наступны дзень — хацелі ўратаваць душу немаўляці, бо баяліся, што ён не будзе жыць: цяжарнасць маці была складанай, роды таксама. Да таго ж, перад гэтым сям'я ўжо пахавала дваіх немаўлят. Аднойчы Антоніа падслухаў гутарку бацькі і маці з лекарам, які казаў, што «хлопчык непазбежна хутка памрэ». Антоніа застаўся жыць, хоць хваробы і дапякалі яго ўсё жыццё: у трыццаць ён выглядаў нашмат старэйшым за аднагодкаў, у пяцьдзясят — глыбока старым.

Аднак у маладосці Антоніа быў сапраўдным дэндзі: аматар лайкавых пальчатак і чорных шаўковых цыліндраў, руды з блакітнымі вачыма. Дзяўчаты вар'яцелі ад гэтага хлопца, аднак Гаўдзі так і застаўся самотным. Нейкі час ён заляцаўся да настаўніцы Пепеты Марэў, аднак, калі прапанаваў ёй набрацца, тая адказала, што ўжо заручаная. Пасля быў кароткі раман з маладой амерыканкай, які скончыўся тым, што яна вярнулася ў Амерыку. Архітэктар вырашыў, што гэта знак, і лёс ягоны — адзінота. Гэта дазволіла цалкам прысвяціць сябе творчасці — стварэнню неверагодных для свайго часу архітэктурных формаў. Дык што ж такога збудаваў Гаўдзі, што вабіць у Барселону мільёны турыстаў?

## Саграда Фамілія: 1882—2030(?)

Упершыню я пабачыў гэты храм у падручніку «Сусветная культура», калі вучыўся ў Беларускім гуманітарным ліцэі. Не паверылася нават адразу, што такі цуд можа недзе існаваць у сапраўднасці!.. Я стаў шукаць іншыя здымкі і звесткі, і калі пераканаўся — стаў марыць сюды патрапіць.



Сціплая спальня вялікага архітэктара.

— Наступная станцыя — Саграда Фамілія, — абвяшчаюць у вагоне метро. І такое адчуванне, што абвяшчаюць: «Наступная станцыя — рэзідэнцыя Пана Бога».

Я выйшаў з метро — і аслупянеў. Відаць, гэта самы велічны і незвычайны храм, які мне даводзілася бачыць у сваім жыцці. Што я бачыў падобнае? Першае, што прыходзіць у галаву, — касцёл Святой Ганны ў Вільні. Ён, праўда, у шмат разоў меншы, па-беларуску камерны — аднак стыль пабудовы, формы і манера нечым падобныя. Пазней, калі я пабачыў здымкі будаўніцтва, — я ўспомніў храм у Сар'і на Верхнядзвіншчыне. Той самы касцёл, які пасля паўстання Каліноўскага перадалі праваслаўным з фармулёўкай «з прычыны асаблівай прыгажосці». Адна частка Саграда Фамілія нагадвае яго вельмі моцна. А Сар'я, дарэчы, збудаваная на сорак гадоў раней!.. Ты глядзіш на фасад Нараджэння і беларусацэнтрычна марыш, што менавіта Сар'я натхніла Гаўдзі на Саграда Фамілія...



Агульны выгляд будоўлі храма.

У Саграда Фамілія два ўваходы. Адзін — для асобных турыстаў. Яго лёгка знайсці — чарга пачынаецца яшчэ на суседняй вуліцы. Другі — для арганізаваных груп (ад 20 чалавек). Побач са мной праходзіць сям'я, якая вязе сваё дзіця (на выгляд гадоў 15) у інвалідным вазку. Дзяўчына на касе адразае:

— Даруйце, але тут толькі для груп!..

Тыя разварочваюцца і засмучаныя з'язджаюць, але ахоўнік, які назіраў за сцэнай, даганяе іх і без чаргі праводзіць праз сувенірную краму, адкуль можна патрапіць адразу да ўвахода ў храм. Як у нас кажуць, і немцы розныя былі.

Самае цікавае, што Саграда Фамілія пачаў будаваць не Гаўдзі, а архітэктар дэль Вільяр. У 1882 годзе была закладзеная крыпта — гэта мусіў быць звычайны храм, якіх шмат. Аднак у першапачатковага архітэктара ўзніклі нейкія непаразуменні з замоўцамі — і ў 1883 годзе сюды прызначаюць Антоніа Гаўдзі (між іншым, па-каталонску ягонае імя пішацца, як і па-беларуску — Антоні), 31-гадовага архітэктара-пачаткоўца.



Саграда Фамілія: фасад Жарсцяў.

Ад першаснага праекта спадар Гаўдзі пакідае толькі крыпту, якую вымушана дабудоўвае. Увесь астатні праект спазнае кардынальныя змены, да непазнавальнасці. Храм, які задумаў Гаўдзі, мусіў поўніцца сімваламі і знакамі. Дванаццаць вежаў прысвячаюцца апосталам, цэнтральная з крыжом — Хрысту. Кожная дэталь фасада — таксама сімвал, як і ўся ўнутраная аздоба.

У 1886 годзе Гаўдзі з упэўненасцю кажа, што праз 10 гадоў храм будзе скончаны. Сёння 2010 год, і паводле самых смелых разлікаў будоўля можа фінішаваць гадоў праз дваццаць, у 2030 годзе. Як на маё вока, дык калі параўнаць, што ёсць і што павінна быць, то збудавалі пакуль недзе трэцюю частку, калі не чацвёртую. Даволі хутка і сам майстар зразумеў, што патрабуецца ў прагнозах, стаў параўноўваць Саграда Фамілія са славутымі храмамі Сярэднявечча, якія будаваліся стагоддзямі. Бачыце, як бывае: пачаў будаваць не ён, скончыць не ён, а будоўлі ўздзейнічаюць сотні рабочых і дзясяткі архітэктараў, а запомніцца да ўсяго свету і застанецца ў стагоддзях ён — Антоніа Гаўдзі.

...Пры жыцці майстар паспеў скончыць дарэшты толькі адзін фасад — фасад Божага Нараджэння. Аднак і тут даверху была збудавана толькі адна званіца. Адметна, што кожны персанаж на фасадзе мае рэальныя прататып. Немаўля Ісус — унук аднаго з будаўнікоў, Юда — вартаўнік-п'яніца, Понцій Пілат — тлусты пастух коз, цар Давід — прыгажун-тынкоўшчык, восліка пазычыў мясцовы гандляр. Каб паказаць сцэну «збіванне немаўлят», Гаўдзі хадзіў у анатамічны тэатр, рабіў злепкі з мёртванароджаных дзяцей...

Пасля гібелі майстра храм дабудоўваецца спачатку вучнямі, а цяпер ужо проста паслядоўнікамі Гаўдзі. Работы ўскладняе акалічнасць, што дон Антоніа не вельмі любіў пакідаць чарцяжы, многае вынашваў у галаве, многае ўдасканальваў у працэсе. Да таго ж, у 1936 годзе ў майстэрні Гаўдзі быў пажар, які многае панішчыў...



Славутая столь і калоны-дрэвы.



Так, паводле задумы Гаўдзі, Саграда Фамілія павінна выглядаць у выніку.

## 62 тысячы рублёў за ўваход у храм

...Узбагачаны ведамі пра будаўніцтва Саграда Фамілія, ты кіруешся ўсярэдзіну. Дзеля гэтага спатрэбіцца некалькі дозаў цярпення. Першая — адстаяць чаргу па квіток. Мне адносна пашанцавала — прыкладна праз паўгадзіны я меў запаветную паперку. Кошт яе — 12 еўра проста за ўваход (46.800 руб.) плюс 4 еўра за аўдыягіда — агулам 62.400 беларускіх рублёў. Але што тут казаць — калі вы прыехалі ў Барселону і пашкадавалі 16 еўра на наведванне Саграда Фамілія — лічыце, што вы з'ездзілі дарма. І наступным разам можаце не выпендрывацца. Купацца ў моры можна і ў Адэсе.

Аўдыягід ёсць на многіх мовах — каталонскай, іспанскай, англійскай, нямецкай, французскай, італьянскай, партугальскай і рускай. Спадзяюся, да адкрыцця храма да іх дадасца яшчэ і беларуская. Аўдыягід даволі падрабязна распавядае, якая дэталь што значыць. Перавагі аўдыягіда — калі што не зразумеў альбо хочаш паглядзець яшчэ раз — цісні кнопку зноў і слухай.

Экскурсія пачынаецца з фасада Жарсцяў. Ён быў збудаваны паводле задумы Гаўдзі, але ажно праз 50 гадоў пасля смерці архітэктара. У 1986 годзе фасад упрыгожылі скульптуры, якія паказваюць усе падзеі Евангелля ад Тайнай Вячэры ды Узнясення Хрыста.

У сярэдзіне храма працягваюцца будаўнічыя работы.

— Вы маеце ўнікальную магчымасць стаць сведкамі будаўніцтва гэтага вялікага храма! Храм будуецца на вашых вачах! — спявае ў вушы аўдыягід.

Пасярод храма стаіць пад'ёмны кран з люлькай — і будаўнікі нешта там зварваюць наверсе... З таго, што ўжо зроблена, найцікавей пабачыць вітражы — і захапіцца тым, як вытанчана і прадумана Гаўдзі падбіраў колеры!.. Адначасова дасягнута і непаўторная гульня святла — і няма адчування, што каляровае шкло паглынае святло, не пускае яго ў храм. Гэтыя мазаічныя вітражы сталі адным з сімвалаў Барселоны — іх можна пабачыць на кубачках і магніціках, нататніках і алоўках, торбах і значках у сувенірных крамах.

Іншая цікавостка — калоны, выкананыя строга па запаветах Гаўдзі. Разумеючы, што пры ягоным жыцці будаўніцтва не будзе скончанае, майстар ільвіную долю часу пусціў не на тое, каб фізічна збудаваць як мага больш, але каб дасканала ўсё прадумаць. Дык вось, калоны гэтыя ўяўляюць сабой дрэвы, а ўсе разам ствараюць лес. На пэўнай вышыні яны пачынаюць разгаліноўвацца і нахіляцца — і апроч дэкаратыўнай функцыі (сапраўды выглядаюць як галінастыя дрэвы) выконваюць такім чынам большую інжынерную функцыю, бо лепш за звычайныя падтрымліваюць купал. Сам купал не мае суцэльнасці — ён выкананы як кроны дрэў, якія практычна шчыльна злучыліся ў адное цэлае. І толькі адтуліны між імі прапускаюць удзень святло сонца, а ўначы — зорнае неба.

Увогуле, неадрыўнасць творчасці Гаўдзі ад прыроды — асобная тэма. Калоны-дрэвы, дэталі-расліны, усемагчымыя жывёлы і расліны як элементы аздобы... А пачыналася ўсё ў дзяцінстве, калі хваравіты хлопчык Антоніа шмат часу бавіў у двух месцах — ці ў майстэрні бацькі-каваля (адкуль і пайшло адчуванне формы), ці проста на прыродзе, дзе да канца жыцця Гаўдзі чэрпаў вобразы і натхненне.

## «Коля, я не разумею, як да гэтай пары яны яго не дабудавалі!..»

— Прайдзіце да супрацьлеглага выхаду і злева пабачыце ліфт, — бадзёра кажа табе аўдыягід.

Аднак традыцыйна для папулярных турыстычных месцаў Барселоны апроч ліфта ты бачыш і даўжэзную чаргу да яго. На бар'ерчыках, якія ўпарадкуюць чаргу, ты заўважаеш у розных месцах таблічкі — «60 хвілін», «45 хвілін», «30 хвілін». Клапатлівыя супрацоўнікі падлічылі загадзя, колькі табе давядзецца стаяць, калі чарга скончаецца ў тым ці іншым месцы. У гэтым выпадку, выглядае, хвілін 40. На справе — нават менш.

У самім ліфце, які імчыць цябе на верх званіцы, ты аддаеш супрацоўніку 2,5 еўра (9.750 рублёў), але іншага варыянта залезці наверх няма. Раней давалі падымацца па вінтавой лесвіцы, але цяпер «у мэтах бяспекі» — толькі на ліфце. Дзіўна, думаеш сам сабе ты, а чаму спускацца па ёй па-ранейшаму можна? Ці тут бяспека дазваляе — калі з турыста ўжо ўзялі ўсё, што магчыма?

Ведаеце, наверх варта злазіць. Тут няма спецыяльнай агляднай пляцоўкі — яе ролю выконвае тэхнічны масточак між дзвюма вежамі. На ім можна затрымлівацца, колькі хочаш, аднак гэта не вельмі зручна — масточак вузенькі, а ліфт прывозіць усё новых і новых аматараў Гаўдзі. А масточак, між іншым, нават нічым не закрыты, глядзіш з яго — а пад табой амаль 100 метраў твора вялікага майстра. Адсюль, з масточка, можна пабачыць, як ідзе будоўля храма — на даху працуе некалькі дзясяткаў будаўнікоў. Сярод будматэрыялаў ты са здзіўленнем заўважаеш цэглу «з дзірачкамі», якая ў нас лічыцца таннай і няякаснай. Няма на іх Антона Астаповіча з Беларускім дабраахвотным таварыствам аховы помнікаў!..

Дарэчы, мае здагадкі былі не беспадстаўнымі. У 2008 годзе больш за 400 інтэлігентаў, дзеячаў культуры Іспаніі падпісалі калектыўны зварот з просьбай спыніць будаўніцтва Саграда Фамілія. Дзеячы культуры лічаць, што твор вялікага архітэктара стаў ахвярай няўмелай, неахайнай рэстаўрацыі ва ўгоду турыстычнай індустрыі.

— Коля, я не разумею, як да гэтай пары яны яго не дабудавалі!.. — чуеш ты зразумелае аднекуль зверху, спускаючыся па знакамітай вінтавой лесвіцы ў вежы храма.

— Дык ім гэта самім нявыгадна! — адказвае нябачны Коля з веданнем справы. — Вунь колькі турыстаў прэцца паглядзець на іх недабудаваны храм, дык нашто спяшацца?! Яны тым часам за гэтыя грошы ўжо палову Барселоны пабудавалі!..

Коля правакуе ў тваёй галаве нескладаныя матэматычныя падлікі. Уваход каштуе ад 12 да 16 еўра, пад'ём наверх 2,5. Возьмем для круглага ліку сярэдняе 15 (пераважная большасць наведнікаў карыстаюцца аўдыягідамі). Есць звесткі, што за год Саграда Фамілія наведваюць пад 3 мільёны турыстаў. Памнажаем — і атрымліваем, што храм прыносіць каля 45 мільёнаў еўра штогод (каля 58 мільёнаў долараў). Плюс яшчэ продаж усялякіх сувеніраў. Салідная сума. Напэўна, сапраўды пры жаданні можна было б будаваць хутчэй... Для параўнання: на аднаўленне Нясвіжскага замка ўсяго выдаткавана каля 70 мільёнаў долараў.



Гэта адна з частак Саграда Фамілія (фота канца XIX стагоддзя)...



...а гэта храм у вёсцы Сар'я Верхнядзвінскага раёна.

## «Каб анёлам было прыемна»

...Называючы Саграда Фамілія аўтаматычна храмам, ты раптоўна ловіш сябе на думцы, што гэта ніякі не храм. Храм — гэта дзе моляцца Богу. А гэта, хутчэй, вялікі помнік Хрысту ды Святым, помнік генію Гаўдзі. А калі пачаць тут маліцца — турыстам жа нязручна будзе, ды і прыбытак скароціцца.

Цікава, што думаў на гэты конт Антоніа Гаўдзі? Ці разлічваў ён на такое, калі хадзіў па вуліцах Барселоны з жалезнай конаўкай і збіраў грошы на будоўлю? Калі ў канцы жыцця перабраўся жыць у майстэрню пры будоўлі, каб не губляць час на штодзённыя паходы дадому? Калі казаў, што гэта — ягонае служэнне, якое мусіць выглядаць гэтак, «каб анёлам было прыемна».

Запытацца ў самога Гаўдзі, але ў крыпту Саграда Фамілія, дзе пахаваны архітэктар, патрапіць. Відаць, там яшчэ не паставілі аўтамат для прыёму манет.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

*Барселона.*

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Казярогам лепш не рызыкаваць, а Блізнятам неабходна запасціся цярпеннем

**АВЕН.** Неабходна падумаць пра павышэнне свайго прафесійнага ўзроўню. У сераду верагодная сітуацыя, якая дазволіць вырашыць гэтае пытанне без вялікіх намаганняў. Пятніца можа аказацца даволі ўдалым часам для пачатку новых спраў. Адмоўцеся ад некаторых старых стэрэатыпаў і поглядаў, якія перашкаджаюць прасоўвацца наперад. У чацвер знайдзіце ў сабе сілы і завяршыце цяжкую работу — вам за яе аддзячаць. Справіўшыся з хатнімі справамі, вы адчуеце задавальненне і радасць ад завершанасці.

**ЦЯЛЕЦ.** Будзе нялішне падагульніць пражытае і адкрыць для сябе новую старонку, запаўненне якой варта пачаць з актыўнага засваення атрыманага вопыту. Багацце інфармацыі складзецца ў новую карціну свету, у якой будуць адказы на жыццёва важныя пытанні. Паспрабуйце не прагаварыцца аб тым патаемным, што ў вас на душы, бо адны могуць не зразумець, а іншыя пазайздросцяць. Пятніца стане адным з самых выдатных дзён тыдня, калі вы пачняце яго ў адпаведным настроі. Усміхайцеся з самай раніцы і паспрабуйце ні з кім не пасварыцца. Чым спакайней праведзяце гэты дзень, тым лепш будзе для вас.

**БЛІЗНЯТЫ.** Для таго, каб прыцягнуць навакольных да рэалізацыі задач, якія стаяць перад вамі, скарыстайцеся сваім дарам пераканання. Прафесійная дзейнасць можа заняць амаль увесь час — і не толькі працоўны. Паспрабуйце запасціся цярпеннем, інакш у сераду непазбежныя сваркі з калегамі і начальствам. Пажадана пазбягаць непатрэбных кантактаў. Скарыстайцеся зручным выпадкам у канцы тыдня, каб праявіць сябе на працы высокакваліфікаваным спецыялістам. Ваша падатлівасць у дачыненні да блізкіх людзей можа прывесці да таго, што з вашым меркаваннем перастануць лічыцца. Так што паспрабуйце не перастарацца. У суботу давядзецца адстойваць свае перакананні — так што аргументы пажадана падрыхтаваць загадзя.

**РАК.** Варта задумацца аб паездцы, якая, як прадказваюць зоркі, адбудзецца ў кастрычніку. Калі ўжо зараз усё спланаваць, вандроўка будзе вельмі ўдалай. У панядзелак магчымыя канфлікты на працы, таму лепш зменшыць зносіны з калегамі і радзей трапляцца на вочы начальству. У аўторак, сераду і чацвер могуць ажыццявіцца самыя патаемныя планы і задумы. У канцы тыдня з'явіцца больш вольнага часу, а спраў і зносінаў стане значна менш.

**ЛЕЎ.** Асабліва важна не мітусіцца. Засяродзьцеся, прааналізуйце сітуацыю, якая склалася, з усіх бакоў — гэта зэканоміць вам час і сілы, якія вы выдаткавалі б на бессэнсоўныя, але працаёмкія мерапрыемствы. Чацвер — добры дзень для навуковай, творчай або інтэлектуальнай працы, для вучобы і ўдасканалення ведаў. У гэты дзень вельмі важная пунктуальнасць. У суботу непажадана працаваць, так што адпачынак можа быць актыўным.

**ДЗЕВА.** Будзьце больш асцярожнымі у дачыненні да калег і сяброў, бо яны могуць вас падвесці або справакаваць на непатрэбную фінансавую рызыку. Не варта расказваць пра свае планы іншым. Гэта гарантуе іх спрыяльнае і своечасовае ажыццяўленне. У пятніцу будзе важна не адмаўляць у адказ на просьбу і выконваць працу, за якую берацеся. Своечасова, паступіць прывабная прапанова, якую варта абдумаць. У нядзелю магчымы разлад у адносінах з блізкімі людзьмі з-за кватэрнага пытання.

**ШАЛІ.** Ваш пераможны наступ на кар'ернай ніве працягнецца або адновіцца з патроенай сілай — яшчэ нядаўна вы не маглі і падумаць пра такі вялікі фронт работ і такія паўнамоцтвы. Але каб у гэтай сітуацыі не аказацца ў стане выціснутага лімона, паспрабуйце прытрымлівацца філасофскіх поглядаў на тое, што адбываецца. У панядзелак настройцеся на нейкую падзею, якая не пройдзе для вас бясследна, — на яе трэба правільна адрэагаваць. У сераду асцерагайцеся інтрыг і подласці.

**СКАРПІЁН.** З'явіцца жаданне нешта змяніць ва ўласным жыцці. У дадатак да жадання будзе і магчымасць. Так што лавіце шанц. Тыдзень спрыяльны для пашырэння сферы дзейнасці, кар'ернага росту, вырашэння сур'ёзных жыццёвых задач. Вас могуць пастаянна ставіць перад праблемай выбару. Не разлічвайце на ўдалы чацвер — магчымыя розныя няўвязкі і састыкоўкі. У пятніцу лёс можа звесці з людзьмі, якія маюць рэальны шанц стаць надзейнымі партнёрамі. Але не спяшайцеся з высновамі, абдумайце ўсё. Пятніца — дзень, калі неабходна будзе аб'ектыўна ацаніць свае сілы і не ўзвальваць на сябе лішні груз, у адваротным выпадку ёсць небяспека надарвацца.

**СТРАЛЕЦ.** За гэты час вы шмат чаго дасягнеце і нават паспееце рэалізаваць практычна ўсе вызначаныя планы, калі паспрабуеце не мітусіцца і верыць ва ўласныя сілы. Пажадана ўстрымацца ад грамадскіх мерапрыемстваў, бо вашы словы, нават сказаныя без усялякай задняй думкі, могуць быць вытлумачаныя не самым лепшым чынам. У аўторак ваш поспех можа выклікаць зайздрасць нядобразычліўцаў. У зносінах з блізкімі людзьмі паспрабуйце пазбягаць саркастычных выказванняў і рэзкасці, беражыце свае і чужыя нервы. Выхадныя прысвяціце хатнім клопатам, але без шуму і мітусні. Дарэчы, пераставіць мэблю цяпер не час.

**КАЗЯРОГ.** Важна пагадзіцца з тым, што любая дробязь можа прывесці да непрадказальных наступстваў. Каб апынуцца на вышыні, неабходна прадумаць усё: як вы будзеце гаварыць, рухацца, ці правільна выбраны імідж... А вось з рызыкоўнымі планамі і дзеяннямі пажадана пачакаць — не апярэджвайце час. Ваша актыўнасць, без залішняй эмацыйнасці, будзе дзейсная. Працоўныя справы паспрабуйце завяршыць у вызначаныя тэрміны — тады пазбегнеце непаразуменняў. У чацвер можа адбыцца непрыемная гутарка з начальнікам. У суботу набудзьце для сябе што-небудзь новае з адзежы, запрасіце да сабе сяброў, прадэманструйце абноўкі — палягчэе.

**ВАДАЛЕЙ.** Тыдзень у цэлым спрыяльны, за выключэннем пятніцы: у гэты дзень магчымыя канфліктныя сітуацыі. Спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўраўнаважанасць, а вось залішняя эмацыйнасць можа перашкодзіць праяве дзелавых якасцяў. Вынікі працы залежаць ад укладання сілаў і таленту. Паспрабуйце лішні раз не з'яўляцца ў полі зроку начальства, пазбягайце канфліктаў. Верагодныя праблемы з роднымі. Не стаўцеся да іх легкадумна, бо яны могуць аказацца нашмат больш складанымі, чым вы гэта ўяўляеце. Пакіньце для самаразвіцця хоць трохі часу — і вы даведаецеся пра сябе шмат новага.

**РЫБЫ.** Паспяховасць вашай дзейнасці можа наўпрост залежаць ад навядзення парадку ў справах і побыце, а арганізаванасць можа адыграць у гэтай сітуацыі не самую апошнюю ролю. Працу з важнай дакументацыяй у сераду планаваць не варта, бо прыкрыя памылкі і недакладнасці практычна непазбежныя. Пачынаючы з чацвярга зможаце развязаць шматлікія вузлы і паспяхова вызваліцца ад таго, у чым даўно загразлі. Максімальна выкарыстайце выхадныя дні для навядзення парадку ў вашым жыцці. Добры час для кароткатэрміновых вандровак за мяжу або паездак па краіне.

Хочаце — верце...

# Жанчыны змогуць нараджаць самі, а крызіс скончыцца ў 2018 годзе?

## Часопіс Forbes сфармуляваў TOP самых гучных навін 2011—2020 гадоў

**Паміж Расіяй і ЗША разгарыцца новы шпіёнскі скандал, на Зямлі народзіцца сямімільярдны чалавек, навукоўцы створаць крылаты аўтамабіль, Ізраіль пачне барацьбу з Іранам, робаты перамогуць рак, а ў свеце пачнуцца першыя кліматычныя войны. Такі прагноз на бліжэйшае дзесяцігоддзе апублікавалі амерыканскія аналітыкі.**



Пра тое, якія падзеі зусім хутка чакаюць свет, распавялі рэдактары часопіса Forbes. Па меркаванні экспертаў, наступны год адзначыцца новым шпіёнскім скандалам паміж Расіяй і ЗША. Спецыялісты лічаць, што ў 2011 годзе расійскія навукоўцы выкрыюць гіганцкую шпіёнскую інтэрнэт-сетку, стваральнікамі якой стануць Злучаныя Штаты і Ізраіль.

У гэтым жа годзе ў Паўночнай Карэі зменіцца кіраўніцтва: на змену 70-гадоваму Кім Чэн Іру, які, па здагадцы аналітыкаў, пакіне гэты свет, прыйдзе яго 29-гадовы сын Кім Чон Ун. І таму што малады чалавек захапляецца баскетбольнымі матчамі амерыканскай лігі НБА, КНДР рэзка пачне наладжваць эканамічныя кантакты з ЗША.

У 2011 годзе ў егіпецкім Каіры на свет з'явіцца сямімільярдны жыхар Зямлі. Па звестках выдання, гэта будзе дзяўчынка, а павіншаваць яе з першым днём нараджэння прыбудзе сам генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун. Навукоўцы ў гэты год таксама не будуць губляць часу і падораць свету першы крылаты аўтамабіль. Яго прыкладны кошт складзе 200 тысяч долараў. Распавялі даследнікі і пра лёс «ашуканца стагоддзя», Бярнарда Мэдафа. Яго знойдуць павешаным ва ўласнай турэмнай камеры, прычым, па меркаванні навукоўцаў, самагубства будзе інсцэнаваным.

У 2012 годзе пачнецца вайна паміж Ізраілем і Іранам. Першы зробіць авіяўдар па ядзерных аб'ектах Тэгерана. Іран жа ў адказ перакрые Армузскі праліў, што прывядзе да рэзкага росту цэнаў на паліва, бо менавіта праз гэты праліў на сусветны рынак пастаўляюцца арабскія нафта і газ.

Яшчэ адной знамянальнай падзеяй гэтага года стане эпідэмія ў Мексіцы. Жыхароў краіны пачне выкошваць новая форма сухотаў, лекі ад якой яшчэ не будуць вынайдзеныя. Распаўсюджванне захворвання ў ЗША і Лацінскай Амерыцы прывядзе да закрыцця дзяржаўнай мяжы.

У 2015 годзе навукоўцы зробяць эпахальнае адкрыццё — будзе вынайдзена таблетка ад аўтызму. Праз год жанчыны атрымаюць канчатковую волю: медыкі правядуць першае аплადненне штучным насеннем. А ў 2020 годзе спецыялісты створаць і канчаткова атрымаюць дазвол на выкарыстанне аўтаномных робатаў, якія будуць знішчаць ракавыя клеткі ў арганізме.

Даследчыкі лічаць, што толькі ў 2018 годзе скончыцца эканамічны крызіс, пра завяршэнне якога ўжо даўно кажуць вядучыя сусветныя эканамісты. У ЗША ўзровень беспрацоўя скароціцца да 7%, а сярод вакансій з'явіцца віртуальны целаахоўнік ці скарбашукальнік для аматараў камп'ютарных гульняў. У гэты ж перыяд у Кітаі будуць узаконены аднаполыя шлюбы. У сувязі з тым, што жанчын у гэтай краіне менш, чым мужчын, мясцовыя ўлады пачнуць актыўна прапагандаваць гомасэксуалізм. Да гэтага моманту на прылаўках крамаў з'явіцца мяса, выгадаванае ў лабараторыях, а ЗША выведуць войскі з Афганістана. Пры гэтым і амерыканцы, і «Талібан», абвесцяць сябе пераможцамі.

У канцы наступнага дзесяцігоддзя свет узрушаць першыя кліматычныя войны. Канфлікт, па меркаванні навукоўцаў, адбудзецца паміж Кітаем, з аднаго боку, і Індыяй і Пакістанам, з другога. Прычынай стане будаўніцтва найвялізнай дамбы ў Тыбеце. У той жа час знакамітае стварэнне Рычарда Брэнсана, Virgin Galactic, адправіць першых касмічных турыстаў на Месяц. Квіток на аднаго чалавека абыдзецца прыкладна ў 200 мільёнаў долараў.



## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *12 октября 2010 года* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Боровлянский с/с, д. Слободщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623680608101000084 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1257 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | – |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 665 539 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 2 869 долларов США |
| 9 | Задаток (рублей) | 800 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 12.10.2010 г. в 9.00.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 6.10.2010 г. Контактный телефон: 204 11 62, 204 35 25.

Задаток перечисляется на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

<u>Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:</u>

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Погляд

Уладзіслаў ІНАЗЕМЦАЎ:

# НЕРАЗБУРАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНАГА РЭГУЛЯВАННЯ РОБІЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ЭКАНОМІКУ ЛЕПШАЙ ЗА РАСІЙСКУЮ

*У апошні час у сродках масавай інфармацыі Расіі, у прыватнасці па цэнтральных тэлеканалах, развязана беспрэцэдэнтная кампанія па дыфамацыі (г. зн. знявазе) палітычнага кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, яе Прэзідэнта, абранага нашай краінай сацыяльна-эканамічнага курсу. Гэты інфармацыйны ўдар, які доўжыцца вось ужо некалькі месяцаў, невыпадковы. Як піша ў апошнім нумары расійская газета* ***«Завтра»****, гэта — своеасаблівае прыкрыццё прайшоўшай нядаўна ў Маскве канферэнцыі «Беларусь—Расія: канец саюза, пачатак прагматычнага супрацоўніцтва?». На гэтае мерапрыемства, арганізаванае расійскімі лібераламі (сярод якіх былі Барыс Нямцоў, Уладзімір Рыжкоў, Уладзімір Мілаў) былі запрошаны прадстаўнікі беларускай апазіцыі. Да апошняга часу падобныя сходкі праходзілі за зачыненымі дзвярыма, паўлегальна, як першыя маёўкі. На гэты ж раз, піша газета «Завтра» ў артыкуле* ***«Воран — ворану...»****, усё праводзілася пры садзейнічанні, пры нябачнай, але вельмі адчувальнай падтрымцы расійскіх палітычных эліт.*

Галоўнымі пытаннямі канферэнцыі сталі складанасці і супярэчнасці ў беларуска-расійскіх адносінах. «Інфармацыйную вайну» Масквы супраць Мінска, не ўдаючыся ў яе сутнасць, выступоўцы расцанілі як «разборку па паняццях». Мінскі журналіст Аляксандр Класкоўскі назваў вядомыя фільмы «мачылавам і прадуктам з душком» і адзначыў, што за беларускую тэматыку ўзяліся дылетанты. Па яго словах, «цяпер беларуская апазіцыя схамянулася, але яна не выкарыстоўвае маскоўскі інфармацыйны ціск, у ёй узмацніліся разборкі і хістанне. Класкоўскі заявіў, што ў Беларусі прарасійскія партыі ці грамадскія рухі адсутнічаюць, няма і фігуры, на якую «мог бы паставіць Крэмль».

Расійскі палітык Уладзімір Рыжкоў заявіў, што Масква раздражнёная непрызнаннем Беларуссю Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, субсідзіраваннем эканомікі, пацяпленнем адносінаў з ЕС, «энергетычным сяброўствам» з Уга Чавесам у абыход Расіі, адносінамі з Грузіяй і Прыбалтыкай, асабліва па альтэрнатыўных шляхах транзіту энерганосьбітаў, заходам Кітая ў рэспубліку.

У кіраўніцтве Расіі ёсць «параноя ў адносінах хуткіх выбараў у Беларусі», лічыць Рыжкоў, і Уладзімір Пуцін не ў сілах перакрыць усё для Аляксандра Лукашэнкі ў Вашынгтоне, Брусэлі, Пекіне. «Анішчанка (галоўны санітарны ўрач РФ) не знойдзе чарвякоў усюды, а Мілер не зможа ўстанавіць кошт на газ у 700$, — у Аляксандра Лукашэнкі няма рэальнага канкурэнта». А еўрапейская мадэль стабільнага развіцця для беларусаў больш пераважная, чым расійская. «Паглядзіце на Маскву з яе «малінавымі пінжакамі, вахабітамі і прастытуткамі, па прывабнасці Расія прайграве і не можа прапанаваць эфектыўную мадэль развіцця. Што, Пуцін — назаўжды?» — сказаў Уладзімір Рыжкоў.

Андрэй Вардамацкі, кіраўнік адной з беларускіх сацыялагічных службаў, прадставіўшы звесткі сацыялагічных даследаванняў, заявіў, што ўдзел так званага прарасійскага кандыдата ў цяперашніх выбарах у Беларусі азначае для таго палітычную смерць, бо ў «грамадстве пераважаюць настроі пошуку дзяржаўнай ідэнтыфікацыі і ўмацавання незалежнасці». Абвал арыенціраў беларусаў на Расію, паводле яго слоў, адбыўся пасля першага газавага канфлікту 2004 года.

У 2010 годзе павялічваецца колькасць беларусаў, якія арыентуюцца на Еўропу, аднак іх колькасць расце павольней, чым адбываецца падзенне арыентацыі на Расію, і еўрапейскай дамінанты цяпер няма. Вардамацкі мяркуе, што сімпатыі да Расіі будуць змяншацца, але рэзкага росту сімпатый да Еўропы не адбудзецца. Відавочна, будзе ўмацоўвацца «тутэйшая» самасвядомасць. Цэнтрам арыентацыі на Расію Вардамацкі лічыць Мінск, паколькі ў сталіцы засяроджаны асноўныя прамысловыя гіганты. А на Еўропу арыентаваны Брэсцкая і Гродзенская вобласці. Але гэты паказчык перавышае арыентацыю на Расію жыхароў гэтых рэгіёнаў. Абсалютнай дамінантай у беларускім грамадстве ў наш час, па словах сацыёлага, з'яўляецца незалежнасць — 74 працэнты апытаных.

У сувязі з гэтым Аляксандр Дабравольскі, вядучы канферэнцыі, адзначыў, што кансэнсус пра незалежнасць у беларускім грамадстве можа абмежаваць інтэграцыйныя перспектывы, і любы абраны прэзідэнт не зможа здаць рэспубліку Крамлю. Па яго меркаванні, цяперашні канфлікт, які выяўляецца ў інфармацыйных нападах, не можа сур'ёзна ўспрымацца паліттэхнолагамі.

Адмысловую ўвагу ўдзельнікі канферэнцыі надалі эканоміцы. Яраслаў Раманчук, беларускі эксперт па эканоміцы, адзначыў той факт, што Беларусь увайшла ў дзясятку краін з найлепшымі ўмовамі рэгістрацыі бізнэсу. Ён выказаўся за ўвядзенне адзіных нарматываў якасці тавараў, што «дазволіць нейтралізаваць Анішчанку», за ліквідацыю ПДВ, паколькі эфектыўнае збіранне гэтага падатку немагчыма з прычыны адсутнасці мяжы, за ўвядзенне залатога рубля ў якасці адзінага аплатнага сродку. Ён выказаўся за дружбу з Расіяй і ўсталяванне рэжыму сумленнага гандлю.

Эканоміка Беларусі не знаходзіцца ў крытычным становішчы — канстатаваў аўтарытэтны расійскі эканаміст Уладзіслаў Іназемцаў. Ён лічыць, што негатыўнае ўздзеянне Расіі на эканоміку Беларусі можна змякчыць. Перакрыжаванае субсідзіраванне эканаміст назваў адказам «досыць кампетэнтнага эканамічнага кіраўніцтва Беларусі» на павелічэнне Расіяй коштаў на энерганосьбіты. Неразбураная сістэма дзяржаўнага рэгулявання робіць беларускую эканоміку лепшай за расійскую. Нягледзячы на памяншэнне расійскіх субсідый, эканоміка рэспублікі выжыве, бо «беларускія ўлады прадпрымаюць дзеянні, накіраваныя на энергазберажэнне». Эканаміст лічыць немагчымым поўную адмову ад расійскіх энергарэсурсаў, а абмежаванне доступу беларускіх тавараў у Расію разглядае як жорсткі ўдар па рэспубліцы. Для паляпшэння стану беларускай эканомікі, па меркаванні эканаміста, ёсць парадку 3-х гадоў. За гэты час могуць зменшыцца кошты на энерганосьбіты, можна павялічыць эфект мер ад энергазберажэння. Эканаміст лічыць, што расійскія палітыкі і алігархі будуць патрабаваць прыватызацыі беларускай дзяржуласнасці і доступу да рынку. Ён параіў пераходзіць на сусветныя стандарты якасці прадукцыі, што адкрые бліжэйшыя еўрапейскія рынкі. Але для такога пераходу патрэбна сур'ёзная тэхналагічная мадэрнізацыя, інвестыцыі, першым чынам, з Еўропы. Уводзіны адзінай беларуска-расійскай валюты Іншаземцаў назваў катастрофай для Беларусі. Мінск, паводле яго слоў, захоўвае надзеі на атрыманне прэферэнцый, у тым ліку і па нафце, і перыяд стагнацыі можа змяніцца перыядам актывізацыі адносінаў. Беларусь і Расія павінны стаць не сыравінным, а прамысловым прыдаткам Еўропы.

Абмяркоўваліся таксама знешняя палітыка і рэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі.

У сваім выступленні вядомы расійскі палітык Барыс Нямцоў назваў інфармацыйную вайну супраць Мінска «істэрыкай, эмацыйным зрывам», за якім няма ніякай тактыкі, а заявы Уладзіміра Пуціна пра тое, што ён не ведаў пра «фільм» «Хросны бацька», хлуснёй. «НТБ знаходзіцца пад кантролем чэкістаў. Уся яго вяшчальная палітыка ўзгоднена з Крамлём. Фільм — танная чэкісцкая прапаганда. У адказ Пуцін можа атрымаць фільм пра сябе», — заявіў Нямцоў. Ён таксама паведаміў, што несістэмная расійская апазіцыя рыхтуе фільм па яго дакладзе пра Пуціна.

Нямцову, па яго прызнанні, балюча назіраць за падрыхтоўкай беларускай апазіцыі да выбараў: няма адзінага кандыдата, адсутнічаюць дамоўленасці разумных людзей.

Па меркаванні беларускага палітолага Валерыя Карбалевіча, інфармацыйная вайна аказала слабае ўздзеянне на беларускую аўдыторыю. Гэта ён растлумачыў абмежаваннем доступу расійскага капіталу, адсутнасцю прарасійскіх палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Палітолаг лічыць, што Мінск «спрабуе сысці ў шэрую зону паміж Еўропай і Масквой для таго, каб гэтыя цэнтры не ўмешваліся ва ўнутраныя справы»...

**Падрыхтаваў Антон ЗАПОЛЬСКІ.**

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *12 октября 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Новодворский с/с, а/г Гатово | Новодворский с/с, а/г Гатово | Новодворский с/с, а/г Гатово | Новодворский с/с, а/г Гатово | Луговослободской с/с, д. Дуброво | Луговослободской с/с, д. Ксаверово | Горанский с/с, д. Чачково | Горанский с/с, д. Новое Поле |
| 2 | Кадастровый номер | 623684301601000357 | 623684301601000363 | 623684301601000365 | 623684301601000362 | 623684103601000043 | 623684107601000087 | 623681319101000436 | 623681351010000204 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1532 га | 0,1538 га | 0,1511 га | 0,1538 га | 0,0989 га | 0,2302 га | 0,2500 га | 0,1541 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 506 546 | 506 546 | 506 546 | 506 546 | 620 311 | 620 311 | 1 209 787 | 1 245 436 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 25 000 000 | 25 000 000 | 24 000 000 | 25 000 000 | 15 000 000 | 22 000 000 | 31 000 000 | 12 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 2 400 000 | 2 400 000 | 2 300 000 | 2 400 000 | 1 400 000 | 2 100 000 | 3 000 000 | 1 100 000 |

| | | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Казаки | Горанский с/с, д. Байдаки | Горанский с/с, д. Байдаки | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Недреска |
| 2 | Кадастровый номер | 623681307601000028 | 623681300601000033 | 623681300601000034 | 623685707101000135 | 623685707101000173 | 623685707101000005 | 623685707101000161 | 623685706601000020 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1785 га | 0,1800 га | 0,1803 га | 0, 1709 га | 0,2425 га | 0,1744 га | 0,1741 га | 0,1822 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 316 596 | 1 226 648 | 1 118 167 | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 70 000 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 8 000 000 | 13 000 000 | 13 000 000 | 17 000 000 | 24 000 000 | 18 000 000 | 18 000 000 | 17 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 700 000 | 1 200 000 | 1 200 000 | 1 600 000 | 2 300 000 | 1 700 000 | 1 700 000 | 1 600 000 |

| | | Лот 17 | Лот 18 | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 | Лот 22 | Лот 23 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Петришковский с/с, д. Вязанка | Михановичский с/с, п. Михановичи | Михановичский с/с, п. Михановичи | Михановичский с/с, д. Котяги | Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Ключевая | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 173 | Острошицко-Городокский с/с, д. Галица |
| 2 | Кадастровый номер | 623685702101000034 | 623684204601001287 | 623684204601001307 | 623684204601000239 | 623681709601001885 | 623686304601000540 | 623685202101000119 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,2465 га | 0,1397 га | 0,1179 га | 0,1014 га | 0,1604 га | 0,1389 га | 0,1685 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 947 280 | 600 670 | 1 285 510 | 587 783 | 1 668 893 | 880 187 | 518 872 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 16 000 000 | 35 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 | 140 000 000 | 12 000 000 | 17 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 500 000 | 3 400 000 | 2 100 000 | 2 100 000 | 13 000 000 | 1 100 000 | 1 600 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 12.10.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 6.10.2010 г. Контактные телефоны: 204 11 62, 204 35 25.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1-4 перечисляется на расчетный счет Новодворского сельисполкома № 3600621100123, ф-л 614 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600230217, ОКПО 04430424, код платежа – 04901.

На Лоты 5–6 – на расчетный счет Луговослободского сельисполкома № 3600621070093 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600537220, ОКПО 04430430, код платежа – 04901.

На Лоты 7–11 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 6000537220, код платежа – 04901.

На Лоты 12–17 – на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386.

На Лоты 18–20 – на расчетный счет Михановичского сельисполкома № 3604621090138 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600303747, код платежа – 04901.

На Лот 21 – на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520, УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

На Лот 22 – на расчетный счет Самохваловичского сельисполкома № 3600621150173 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424 ОКПО 04430482, код платежа – 04901.

На Лот 23 – на расчетный счет Острошицко-Городокского сельисполкома № 3600621110139 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600208279, ОКПО 04430447, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

<u>Документы, необходимые для участия в аукционе:</u>

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *14 октября 2010 года* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Колодищанский с/с, п. Городище | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Щитомиричи | Минский район, Юзуфовский с/с, д. Масловичи | Минский район, Горанский с/с, д. Байдаки | Минский район, Мачулищанский с/с, г.п. Мачулищи | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, Сеницкий с/с, д. Урожайная | Минский район, Сеницкий с/с, д. Урожайная |
| 2 | Кадастровый номер | 623683903601000064 | 623683402101000428 | 623686600001000221 | 623688205601000246 | 623681300601000031 | 623655500001000303 | 623681708601002213 | 623686600001000220 | 623686600001000219 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0386 га | 0,2001 га | 1,3473 га | 0,0868 га | 0,1000 га | 0,5004 га | 0,8501 га | 1,6808 га | 0,3994 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 51 | 31 | 51 | 51 | 51 | 51 | 40 | 71 | 71 |
| 5 | Целевое назначение | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Под строительство магазина стройматериалов | Под строительство производственно-складских помещений | Для строительства торгового объекта | Под строительство объекта придорожного сервиса | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства гостиницы на 100 мест с рестораном на 150 мест | Для строительства оздоровительного центра с административным зданием |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | 630 300 | 828 130 | 62 722 800 | 773 180 | – | 8 487 405 | – | – | – |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 2 156 134 | 704 199 | 1 597 022 | 837 428 | 776 868 | 1 827 820 | 2 151 045 | 833 751 | 1 050 643 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 516 долларов США | 7 780 долларов США | 110 525 долларов США | 1 060 долларов США | 1 597 долларов США | 35 851,36 доллара США | 33 676,20 доллара США | 429 842 445 белорусских рублей | 102 141 296 белорусских рублей |
| 9 | Задаток (рублей) | 140 000 | 2 200 000 | 32 000 000 | 300 000 | 400 000 | 10 150 000 | 9 540 000 | 42 000 000 | 10 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 14.10.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 08.10.2010 г. Контактные телефоны: 204 11 62, 204 35 25.

Задаток перечисляется на р/с 3641000233719, Отделение № 537, г. Минск ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

<u>Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:</u>

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

# КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.



## ПАЭТЫЧНАЯ МАЗАІКА

**Па гарызанталі:** 1. Частка войска, якая знаходзіцца наперадзе галоўных сілаў. 4. Старадаўні спосаб марскога бою. 8. «Дзень добры, любая, ... мой яснавокі!». З верша А. Міцкевіча «Дзень добры». 9. Карлікавы буйвал. 11. Зборнік выбраных мастацкіх твораў розных аўтараў. 14. «Сенажаці збілі коні, \\ І пасохла ...». З верша Уладзіміра Хадыкі «Снапок аўса». 15. «Скрыпка — хлеб твой і...». З паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка». 16. Тое, што і біяполе. 17. «...панікне галава -\\ Ўзрастуць мацнейшыя галоўкі». З верша У. Дубоўкі «На самой Радзіме». Сёлета — 110 гадоў з дня нараджэння паэта. 20. «Хоць гналі цябе, накладалі ... \\ Дый дарма: жывеш, як жыло!». З верша Я. Купалы «Роднае слова». 21. У старажытнарымскай міфалогіі — багіня, якая вартавала жніво. 26. Галоўны герой паэмы Ф. Багушэвіча «Кепска будзе!». Сёлета краіна адзначыла 170 гадоў з дня нараджэння паэта. 28. «Калі рука злучылася з рукой \\ У поціску, як дружбы нашай ...». З верша Пімена Панчанкі «Цагліна з дома Паўлава». 29. Прыйшоў... — цягне ўгору авёс (прык.). 30. «Пайшоў Янка ў грыбы, \\ Тацяна ў...». З паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон». 31. Дадатковае тлумачэнне, заўвага.

**Па вертыкалі:** 1. Слова, утворанае перастаноўкай літар іншага слова. 2. «Сава, ... ды сонца». Байка К. Крапівы. 3. «У ..., у ваду // Я за ёю пайду». З верша Я. Купалы «За свабоду сваю». 5. «Ты — непераможная , \\ ...народная!». З верша П. Пестрака «Армія Чырвоная». 6. «Звісае бэз у ... букетам». З верша Цёткі (Алаізы Пашкевіч) «Мой сад». 7. «...-самалёты свідруюць прастор». З верша Я. Купалы «Заўсёды наперад». 10. «Соль у шклянцы // І свежага хлеба...». З верша С. Грахоўскага «На таёжнай дарозе». 12. Прафесія акцёра. 13. «... над тымі капцамі \\ Сыта бубніць авадзень». З верша «Балада пра паўстанца Ваўкалак» У. Караткевіча. 18. Дзе каша і..., там і грамадка (прык). 19. Збор невялікіх літаратурных ці музычных твораў. 22. Імя беларускага паэта Жаўрука (сапр. прозвішча Сінічкін). 23. «...страшэнна горыч у грудзях застала». З верша К. Каліноўскага «Марыська чарнаброва, галубка мая!». 24. ...Кастусь. Прозвішча пісьменніка (сапраўднае — Качан). 25. «І лезе сонца проста з горкі \\ У партызанскі наш...». З верша М. Машары «Мая азёрная краіна». 27. У антычнай міфалогіі бог кахання.

Падказка: **усе словы крыжаванкі пачынаюцца з літары А.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.35 | 19.36 | 13.01 |
| Віцебск — | 6.23 | 19.27 | 13.04 |
| Магілёў — | 6.25 | 19.27 | 13.02 |
| Гомель — | 6.23 | 19.22 | 12.59 |
| Гродна — | 6.50 | 19.51 | 13.01 |
| Брэст — | 6.53 | 19.50 | 12.57 |

**Месяц**

*Маладзік 8 верасня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

*Пр. АДСЯЧЭННЕ ГАЛАВЫ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ.*

*К. Прота, Пятра, Фелікса, Яна, Яцка.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Крыжаванка (4 верасня). Па гарызанталі:** 1. Бярэсце. 4. Паперня. 8. Сказ. 9. «Звон». 11. «Летапісец». 14. Устаў. 15. Кельт. 16. Саха. 17. Мацi. 20. Іонік. 21. Кніга. 26. «Евангелле». 28. Асот. 29. Ліст. 30. Фаліянт. 31. Блакнот. **Па вертыкалі:** 2. Явар. 3. Санет. 5. Пацей. 6. Ніва. 7. Кіпа. 8. Салунь. 10. Нестар. 12. «Катэхізіс». 13. Пергамент. 18. Кніжка. 19. Статут. 22. Хваля. 23. Згіб. 24. Слова. 25. Мова. 27. Біро.

**Сканворд (7 верасня). Па гарызанталі:** Рабінзон. Паром. Маса. Кедр. Ікра. Плён. Арменія. Звер. Арк. «Аса». Рупія. Бульба. Акр. Рука. Тэнар. Каракас. Гранат. Аксалат. Сом. Ява. Ямс. Цюльпан. Шчака. Кафэ. Ананд. Тайна. Лік. Ляда. Капуста. **Па вертыкалі:** Аброк. Сыч. Дувал. Арго. Армяк. Прабабка. Мангал. Сак. Аніс. Рэпа. Раса. Катод. Асіна. Тырана. Бурак. Файл. Рак. Цэннік. Муар. Дака. Морж. Сал. Рэха. Нептун. Ляп. Канава. Цыбуля. Явар. Танкетка.

# НУ ВЕЛЬМІ ДЗІЎНЫЯ ПРАФЕСІІ

**У свеце нямала дзіўных работ, але некаторыя з іх проста ўражваюць (а часам і весяляць) сваёй незвычайнасцю.**

**Спецыяліст па высыханні фарбы.** Гэта спецыфічная пра-



фесія прадугледжвае неабходнасць адсочвання часу высыхання фарбы. Усё менавіта так і выглядае, як мы бачым на фота — мужчына трымае таймер, і правярае, ці высахла фарба. Як толькі яна высыхае, ён запісвае час поўнага высыхання. Нельга сказаць, каб гэта была вельмі ўжо займальная прафесія, пагадзіцеся. Ды і кар'ерны рост сумніўны.

**Спецыяліст па бяспецы какосавых пальмаў.** Так, для таго, каб зрабіць рай накшталт Віргінскіх астравоў бяспечным, неабходна прыкласці некаторыя



намаганні. Якія? Ну, напрыклад, своечасова абрываць какосавыя арэхі з пальмаў, каб тыя не маглі прызямліцца на галаву турыстаў, якія нічога не падазраюць і вырашылі проста адпачыць у цені такой пальмы. Спецыяліст па бяспецы аб'язджае гатэлі і прыватныя гаспадаркі, абрываючы ўсе какосавыя арэхі, якія могуць уяўляць небяспеку. Што ж, даволі цікавая праца.

**Спецыяліст па вызначэнні полу куранят.** Гэта даволі распаўсюджаная прафесія, у адрозненне ад папярэдніх дзвюх. Такі чалавек кожны дзень аддзяляе



будучых курачак ад будучых пеўнікаў. На фота ўсё выдатна відаць — тут даводзіцца ўсё рабіць уручную, пакуль што не ўсе працэсы на ферме можна аўтаматызаваць. А вось вызначэнне будучага полу — вельмі важны працэс, які дазваляе аддзяліць курачак, якія трапяць на адну ферму, ад пеўнікаў, якія накіруюцца на іншую.

**Ламальнік яек.** Даволі дзіўная прафесія, якая складаецца ў неабходнасці аддзяляць жаўток ад бялку. Так-так, гэта яшчэ адзін працэс, на які машыны проста няздольныя — толькі чалавек пакуль можа правільна і



якасна разбіць яйка, і аддзяліць жаўток ад бялку. Дзіўна, што цяпер мы можам атрымліваць паведамленні ад людзей, змешчаных на супрацьлеглым боку зямнога шара, дзякуючы тэхналогіям, але аддзяленне бялку ад жаўтка машыннай індустрыі непадуладна.

**Лавец камароў.** Прычым такі чалавек не проста ловіць камароў, а чакае, пакуль тыя насмокчуцца яго крыві, і толькі затым усмоктвае камароў спецыяльным апаратам, нейкім такім «камарасмокам». Навошта гэта робіцца? Для таго, каб сабраць як мага больш інфармацыі пра тое, як адбываецца заражэнне чалавека малярыяй, што дапамагае знайсці больш эфектыўныя лекі, якія дапамагаюць змагацца з гэтым небяспечным



захворваннем. Сярэдняя норма зборшчыка маскітаў — 3000 насякомых у дзень. Можна ўявіць, колькі ўкусаў даводзіцца пераносіць небараку.

## Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

## РАЗУМНАЕ ЛЮСТЭРКА

**«Разумныя» люстэркі з'явіліся ў некаторых амерыканскіх і брытанскіх касметычных крамах. Унікальныя прылады, створаныя спецыялістамі IBM, працуюць вельмі проста: яны робяць фотаздымак пакупніцы, а потым паказваюць ёй, як той ці іншы касметычны прадукт будзе выглядаць на яе твары.**



Для таго, каб «паспрабаваць» касметычны сродак, трэба ўсяго толькі паднесці рыску-код упадабанага тавару да спецыяльнага датчыка прыстасавання. Праз некалькі секунд у люстэрку з'явіцца малюнак твару пакупніцы менавіта з гэтым касметычным прадуктам. Прадстаўнікі крам, якія ўжо ўсталявалі тэхнічныя навінкі ў сваіх залах, называюць адразу некалькі плюсоў такога прыстасавання. Так, па іх словах, новыя люстэркі са стоадсоткавай дакладнасцю паказваюць, як будзе выглядаць касметыка на твары. Па-другое, карыстанне такім памагатым непараўнальна больш гігіенічнае за пробнікі. А па-трэцяе, пакупніцам больш не прыйдзецца пэцкаць рукі памадамі і танальнымі крэмамі. З мінусаў жа ёсць толькі адзін — «разумнае» люстэрка не зможа прадказаць, ці не выкліча той ці іншы касметычны прадукт алергію ў людзей з адчувальнай скурай.

Засмучае пакупніц і той факт, што з дапамогай новых прылад можна прымераць не ўвесь асартымент касметычных крам. Пакуль згоду на свой удзел у эксперыменце далі толькі вытворцы самых недарагіх марак.

# НОВАЯ НЕБЯСПЕЧНАЯ МОДА Ў ПАДЛЕТКАЎ

**У французскай моладзі з'явілася новая мода: заліваючы алкаголь у вочы, падлеткі разлічваюць, што ап'янеюць хутчэй. Гэтая мода прыйшла ў Францыю з брытанскіх кампусаў (студэнцкіх сацыяльных сетак) і YouTube.**



Па прызнанні дзіцячага псіхіятра Патрыса Уэра, у Францыі гэтая тэндэнцыя носіць маргінальны характар, «яна тлумачыцца імкненнем маладых людзей дайсці да мяжы». «У апошнія гады істотна ўзмацніўся не толькі алкагалізм сярод падлеткаў, але і пошук новых крыніц узрушанасці, якія пагражаюць рызыкай», — прызнае спецыяліст. Галоўная мэта залівання алкаголю ў вочы — імкненне адрозніцца, таму што ап'янець праз вочы немагчыма, падкрэслівае Уэр.

Наступствы такіх гульняў могуць быць непапраўнымі: алкаголь у вачах можа пашкодзіць вочную абалонку або прывесці да праблем са зрокам. Найбольшую трывогу, па меркаванні Уэра, выклікае той факт, што схільнасць да алкагалізму, раней уласцівую студэнтам, зараз дэманструюць школьнікі 11—13 гадоў.




## Дзве даты

## 11 верасня

**1918 год** — выйшаў дэкрэт аб увядзенні міжнароднай метрычнай сістэмы мер і вагі на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны. Для гэтага быў устаноўлены пераходны перыяд — да 31 студзеня 1924 года.



**1877 год** — нарадзіўся Фелікс Дзяржынскі, вядомы дзеяч камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы, актыўны ўдзельнік польскага і расійскага рэвалюцыйнага руху. З 1917 года — заснавальнік і старшыня Усерасійскай надзвычайнай камісіі (ВЧК), ДПУ, затым — наркам унутраных спраў РСФСР, старшыня ВСНГ СССР, старшыня камісіі па паляпшэнні жыцця дзяцей.

## Цытата дня:

*«Жыццё кароткае, калі лічыць, што назвы «жыццё» яно заслугоўвае толькі тады, калі дорыць нам радасць. Сабраўшы ў адно ўвесь прыемна праведзены час, мы звядзём доўгія гады ўсяго да некалькіх месяцаў».*

**Жан дэ Лабруер, французскі пісьменнік.**

Сардэчна віншуем нашу любімую **Валянціну Міхайлаўну ГАРДЗЕЙЧЫК** з юбілеем і жадаем, каб сэрца білася рытмічна, ногі ступалі ўпэўнена, дочкі і ўнукі кожны дзень прыносілі радасць.

**Сястра Марыя і ўсе родныя з Гомеля.**

12 верасня спаўняецца **85 гадоў Валянціне Міхайлаўне ГАРДЗЕЙЧЫК**, жанчыне шчырай душы і сэрца, вялікай працаўніцы, актывістцы па жыцці, выдатнай матулі і бабулі.

**Суседзі з Хойнікаў.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КУЛІНАРНЫ НАТАТНІК

## Чатні з яблыкаў



**Паспрабуем зварыць несалодкае варэнне з яблыкаў. Яно будзе называцца загадкавым індыйскім словам «чатні» і прыдасца ў якасці соусу — у асноўным да курыцы, але можна і да іншага мяса. Ды і гародніну з ім можна патушыць.**

Яблыкі падрыхтуйце, як на варэнне. Толькі выбірайце кіслыя гатункі — так будзе смачней. Як след апырскайце яблыкі лімонным сокам і толькі зусім трохі перасыпце цукрам.

Калі яблыкі дадуць сок, складзіце іх у каструлю. Дадайце да яблыкаў соль, чорны і чырвоны перац, кары, любую сухую зеляніну, якая ёсць у доме (галоўнае — не перабраць), сухі молаты або свежы здробнены часнок, імбір, каляндру і іншыя спецыі. Павінна атрымацца даволі рэзкая і вострая страва. Вар'іраваць спецыі можна ў залежнасці ад густу.

Самая ўдалая вострая прыправа (дакладней, камплект прыпраў) для чатні — гэта гарам-масала. Купіць яе можна ў крамах індыйскіх спецый.

Затым варыце на невялікім агні, актыўна памешваючы, каб не прыгарала. Гатовы прадукт разліце па слоіках, астудзіце і пастаўце ў халадзільнік.

Можна варыць чатні з дабаўленнем любой наяўнай садавіны. Напрыклад, сліў. Памідоры, дарэчы, таксама падыходзяць — атрымаецца даволі прыемны аналаг кетчупу. Заадно страва стане больш звыклай для тых, хто не разумее смелых кулінарных эксперыментаў. Бывае і бананавы чатні, і чатні з манга, з груш і мільён іншых разнавіднасцяў. Акрамя таго, садавіну і гародніну можна змешваць у розных прапорцыях. Вось дзе сапраўдны прастор для творчасці! Нядрэнны чатні выходзіць з чырвонай парэчкі. Варта зварыць іх з соллю і перцам (у разумнай колькасці, вядома), і атрымаецца арыгінальны і асвяжальны соус.

Дасведчаныя людзі дадаюць у чатні адмысловым чынам топленае сметанковае масла — гі. І яшчэ цыбулю. Для эксперымента можна дадаць у соус трохі яблычнага або віннага воцату. А варыць соус трэба доўга, пакуль не згусне. І ўвесь час памешваць. Але вынік таго варты.

Разумныя людзі кажуць, што адразу пасля прыгатавання чатні есці нельга. Ён павінен настаяцца як мінімум месяц. Захоўваць яго, калі не закатваць, лепш у халодным месцы — у халадзільніку або ў склепе.

Калі вы вырашыце прыгатаваць з гэтым соусам якое-небудзь мяса, нарэжце яго невялікімі кавалачкамі і на некаторы час замарынуйце ў чатні. Потым ужо можна ўсё разам выкласці на патэльню і тушыць да гатоўнасці. Але можна падаць соус і да гатовага мяса.

## Незвычайныя гарніры

Напрыклад, да смажанай свініны выдатна ідуць смажаныя яблыкі. Калі свініна тлустая, то досыць таго сала, якое ўжо вытапілася з яе на патэльню. Калі посная — пакладзіце некалькі кавалачкаў бекону, пачакайце, пакуль яны пусцяць тлушч, і абсмажце на ім лустачкі яблыка да румянай скарыначкі. Можна іх пасаліць, паперчыць і пасыпаць зелянінай. Зразумела, яблыкі варта браць кіслых сакавітых гатункаў. Такі гарнір падыходзіць не толькі да свініны, але і да курыцы (і любой птушкі) або смажанай ялавічыны. Можна паспрабаваць падаць смажаныя яблыкі і да бараніны.



-2686-

РАСЛІНЫ Ў ДОМЕ

## Яны не баяцца цемнаты

**Сцындапсус**



У Брытаніі гэтую ліяну з пярэстым васковым лісцем завуць «чортаў плюшч». Жоўтыя або белыя разводы, падцёкі і пырскі ўпрыгожваюць ярка-зялёнае лісце сцындапсуса. Аднак будзьце гатовыя да таго, што ў поўным цені яно можа злёгку паблекнуць. Гэтая папулярная расліна выдатна глядзіцца і ў кашпо, і проста пушчаная па сцяне. Не выносіць скразнякоў, сухога паветра і прамога сонца. Часцей апырсквайце сцындапсус. Каб расліна галінавалася, канцы сцеблаў прышчыпваюць.

**Філадэндрон лазун**



Філадэндрон — трапічная расліна, якая любіць вельмі вільготнае паветра і рассеяны свет. Філадэндрон лазун з ярка-зялёным бліскучым лісцем — гэта ліяна, самая маленькая і непатрабавальная з усяго сямейства. Яна добра расце ў цені. Паколькі філадэндрон — ліяна, таму ў вазон абавязкова ўторкніце касматы слупок, які стане для расліны апорай. І не забудзьцеся пра рэгулярнае апырскванне.

### РАСТУЦЬ У ПАЎЦЕНІ

***Для нармальнага росту гэтым раслінам досыць знаходзіцца ўбаку ад акна, якое добра асветлена, а акно, у якім не бывае сонца, стане для іх раскошным прыстанкам.***

**Драцэна аблямаваная**



Драцэна аблямаваная мае вузкія і доўгія (да 70 см) лісты з чырвонымі беражкамі. Яна — адна з самых непатрабавальных у сямействе. Лёгка мірыцца з зацененасцю, нядбайным доглядам і паніжэннем тэмпературы ўзімку (нават ніжэй +10°С). Лепш за ўсё драцэна будзе пачувацца ў лёгкім цені, каля ўсходняга або заходняга акна. Хоць бы зрэдку яе варта апырскваць.

**Папараць**



Гэтыя трапічныя расліны гатовыя расці ў цені, але яны не пераносяць сухога паветра. Але і ім неабходна частае апырскванне лісця, асабліва падчас ацяпляльнага сезона. Сачыце, каб зямля ў вазоне з папараццю заўсёды была вільготнай.

**Плюшч**



Вельмі папулярная ліяна, якая хутка расце, пакрываючы зялёным «вадаспадам» сцены. Відаў плюшчу вялікае мноства — з авальным і зорчатым, роўным і гафрыраваным лісцем. Сакрэты поспеху ў вырошчванні плюшчу: паўцень, абавязковая апора, частае апырскванне (у тым ліку ўзімку!), перасадка раз у два гады ў вазон большага дыяметра.

**Толмія**



Гэты кусцік з апушанага ярка-зялёнага лісця — адна з самых вынослівых пакаёвых раслін. Яна выдатна сябе адчувае ў прахалодным памяшканні ўдалечыні ад прамога сонца. Толмія не баіцца скразнякоў. Але гарачае і сухое паветра для яе згубнае.

**Фатсія**



Расліна любіць прахалоду і яркае святло, але можа прыстасавацца да любых умоў. Лепш набываць невялікую расліну — яна хутка вырасце (калі падкормліваць і штогод перасаджваць) і ўжо праз пару гадоў дасягне метровай вышыні. Каб атрымаўся аб'ёмны куст, кожную вясну падразайце канцы пабегаў. Фатсія любіць частае апырскванне, а таксама прымаць час ад часу душ.

*(Заканчэнне ў наступным нумары ХЭ).*

-2687-

# БЕЛЫ ВЯНОК, БЕЛЫ ФАРТУШОК...

**На Радаўніцу на надмагільныя крыжы (знак роўнасці перад Богам) павязвалі адпаведныя знакі-сімвалы: на магіле дзяўчыны — белы вянок; на магіле жанчыны — белы фартушок. Атрыбутыўнай дыферэнцыяцыі «хлопчык—юнак—мужчына» хутчэй за ўсё не было: хлопец нарадзіўся ў гэтай хаце, ажаніўся тут жа, прозвішча не змяніў, таму і не мяняўся знак-маркёр.**

- Недакладнае (ці няўважлівае) прачытанне рытуальных сітуацый, якія характарызуюць спрадвечную традыцыю, прыводзіць да адвольнага ўжывання ключавых атрыбутаў у жыцці нашых сучаснікаў. Міжпакаленная перарванасць традыцыі правакуе непаразуменні, у аснове якіх ляжыць вядомы прынцып «чулі звон, ды не ведаюць, адкуль ён».
- Што ж мы робім, калі дзяўчынак — удзельніц фальклорна-этнаграфічных гурткоў — апранаем у рытуальныя традыцыйныя строі, абавязковым элементам якіх з'яўляюцца фартушкі (у народзе іх часта называюць «шырма»)? Гэтымі самымі «шырмамі» пасля вяселля адгароджвалі частку хаты, дзе спалі маладыя.
- І, наадварот, ганарышся і радуешся за культуру сваіх продкаў і веданне традыцый тутэйшымі жыхарамі, калі бачыш, як на крыжах, якія стаяць пасярэдзіне або на ўскрайку вёскі і выконваюць ахоўна-засцерагальную функцыю, павязаны адначасова і ручнік, і вянок, і фартушок, прызначаныя перасцерагчы ўсіх жыхароў вёскі: малых і старых, дзяўчат і хлопцаў.
- На Беларусі існавала цудоўная традыцыя першага рытуальнага купання дзіцяці. Бабуля асцярожна купала немаўля, кладучы ў драўляныя ночвы неабходныя атрыбуты (якія павінны былі паўплываць на лёс чалавека), **спавівала ў белыя пялёнкі і перавязвала поясам чырвонага колеру**. Падкрэсліваем, адным і тым жа — **чырвоным поясам — перавязвалі і хлопчыка, і дзяўчынку**. Сучасныя матулі і бабулі «запазычылі» чужую традыцыю і перавязваюць нованароджаных дзяўчынак ружовымі, а хлопчыкаў блакітнымі стужкамі. Нават няёмка тлумачыць, якую сэнсавую нагрузку нясуць ружовыя і блакітныя паўтоны ў культуры шматлікіх краін свету.
- **Амбівалентнасць белага колеру** (г.зн. адначасовая яго скіраванасць у мінулае і ў будучыню), які агортвае з двух бакоў **чырвоную паласу жыцця (сапраўднага)**, дае магчымасць зразумець тоеснасць, здавалася б, разнапалюсных устойлівых словазлучэнняў: «нарадзіўся на белы свет» і «пайшоў на той свет».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Калі мужчына кажа табе «Прыязджай, нам трэба сур'ёзна пагаварыць», гэта значыць трэба браць гарэлку; калі жанчына — значыць, трэба браць грошы.**

☺

На сайце знаёмстваў:
— Ты стрыптызёрка?
— Не, гэта вясло на фота.

☺

**А потым Андрэя Шаўчэнку выдалілі з поля за неспартыўныя паводзіны.**
**Ён біўся, крыўляўся, лаяўся... Увогуле, замінаў камбайнерам убіраць кукурузу.**

☺

— Вой, давай толькі без гэтага: «Мяне цяжка знайсці, але лёгка страціць». Ты што, шкарпэтка, ці што?!...

☺

**Ідуць двое з бутэлькай.**
**— Дзе вып'ем?**
**— Пайшлі да Сцяпана.**
**— Дык ён жа ў камандзіроўцы...**
**— Толькі што прыехаў — глядзі, пад яго балконам на сёмым паверсе мужык голы віціць.**

☺

ЗША заявілі, што неўзабаве перададуць пацярпелым ад паводкі пакістанцам 25 мільёнаў чаго-небудзь.




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4451 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12